Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 8 (28372)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**У дэкрэт аб «утрыманцах» унесены карэктывы**

СТАР. 2



**Рутэнка завяршае спартыўную кар'еру**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ія МАЛКІНА, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Мы плануем прапрацаваць пытанне аб унясенні зменняў у закон аб дзяржаўных закупках тавараў, работ, паслуг, каб стымуляваць так званыя зялёныя закупкі. Гэта значыць, што прадпрыемства-пастаўшчык павінна адпавядаць пэўным патрабаванням у частцы абарачэння адходаў, водаспажывання, выкідаў у атмасфернае паветра і іншае. Увядзенне такога крытэрыя ацэнкі пры ажыццяўленні дзяржзакупак магло б у значнай ступені стымуляваць пастаўшчыкоў да ўкаранення чыстых, экалагічных тэхналогій вытворчасці. Сумесна з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю мы плануем у 2017—2018 гадах гэтыя змены прыняць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9542 | ▼ |
| Еўра | 2,0774 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0715 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ВА ЎЛАДАННЯХ ШАПАВАЛАЎ



Гэтай марознай зімой прадукцыя Смілавіцкай валяльна-лямцавай фабрыкі — валёнкі, ідзе нарасхват. Штомесяц тут выпускаюць каля васьмі тысяч пар 33 мадэляў, большасць з якіх ідзе на экспарт. Праца шапавала застаецца нялёгкай. Каб ператварыць воўну ў цёплы абутак, патрэбны і час, і сілы, і адмысловыя машыны. Насадчык Аляксандр ЮК працуе на фінішнай прамой працэсу — ён надае валёнкам належную форму.

Фота БЕЛТА.

■ Разумныя грошы

## СЯБРАВАЦЬ З ФІНАНСАМІ — З ШАСЦІ ГАДОЎ

**У Нацбанку ўпэўнены, што першыя крокі знаёмства з грашовай тэмай нашы дзеці павінны рабіць у пачатковых класах**

**Ужо на працягу трох гадоў Белаграпрамбанк рэалізуе ўнікальны праект па павышэнні фінансавай адукаванасці «Твае першыя фінансы». За час яго існавання больш за 200 тысяч вучняў сельскіх і гарадскіх школ па ўсёй краіне атрымалі ў падарунак ад банка аднайменны зборнік казак на фінансавую тэму. Днямі ў Мінску падводзілі папярэднія вынікі гэтай штогадовай рэспубліканскай праграмы, у якой у 2016 годзе прынялі ўдзел каля 96 тысяч беларускіх дзяцей. За гэты час у рамках праекта работнікі банка правялі больш як 300 адкрытых інтэрактыўных урокаў у школах ва ўсіх рэгіёнах краіны.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### Папулярна і на мове

У кнізе «Твае першыя фінансы», якая прадстаўляе сабой маляўнічы зборнік казак для дзяцей на беларускай мове, у цікавай і даступнай форме апавядаецца пра гісторыю з'яўлення грошай, пра карысць і патрэбнасць банкаў, пра тое, як правільна карыстацца грашыма, што значыць быць фінансава адукаваным і сучасным, пра тое, што такое ўклады, крэдыты, банкаўская плацежная картка, і многае іншае. А расказвае ўсё гэта на старонках кнігі ўжо вядомы фірменны персанаж дзіцячай зберагальнай праграмы Белаграпрамбанка Агрык.

СТАР. 4

■ Нацыянальны гонар

## КУПАЛА — ТОЙ, ХТО НАС ЯДНАЕ

**Год песняра афіцыйна стартаваў**

**Заўважана, што з цягам часу постаці знакавых для народа асоб ператвараюцца ў нежывыя бронзавыя фігуры, а іх спадчына, расцягнутая на цытаты, проста бясконца тыражуецца, глыбока не вывучаецца, не перагледаецца кожным новым пакаленнем. Але мне падаецца, што беларуская літаратура, з'яўляючыся літаратурай новай, народжанай у пачатку ХХ стагоддзя, яшчэ доўга будзе гэткай жа свежай, а постаці нашых класікаў — жывымі. Магчыма, справа ў тым, што мы і сёння можам дакрануцца да іх спадчыны, пабываць у тых мясцінах, дзе яны бывалі, пабачыць рукапісы і цалкам, без сучасных адаптацый і перакладаў, зразумець іх творы. Таму і сэрца нашай класічнай літаратуры яшчэ б'ецца, а постаці песняроў — дыхаюць. Яны знаёмыя, родныя, але і загадкавыя адначасова, бо хаваюць мноства нераскрытых таямніц.**

СТАР. 4




Іван Паўлаў. Партрэт Янкі Купалы. Гравюра 1931 г.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# У дэкрэт аб «утрыманцах» унесены карэктывы

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 студзеня падпісаў дэкрэт №1, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў у дэкрэт ад 2 красавіка 2015 г. №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дэкрэтам удакладнены пералік перыядаў дзейнасці, на працягу якіх грамадзяне прызнаюцца тымі, хто ўдзельнічае ў фінансаванні дзяржаўных расходаў.

Так, да асоб, якія ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных расходаў, аднесены грамадзяне ў перыяд іх знаходжання ў спісачным складзе нацыянальнай або зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па відах спорту, праходжання імі альтэрнатыўнай службы, прымянення да іх прадугледжаных заканадаўчымі актамі мер па гарантаванні бяспекі, якія не дазвалялі ім удзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў.

Грамадзяне, якія стаяць на ўліку беспрацоўных або якія навучаюцца па накіраванні органа па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, будуць прызнавацца тымі, хто ўдзельнічае ў фінансаванні дзяржаўных расходаў, толькі пры адсутнасці ўстаноўленых фактаў парушэння імі абавязкаў у галіне занятасці насельніцтва, а асобы, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў, — пры ўмове, што дзіця ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў не атрымлівае дашкольную адукацыю.

Таксама за мясцовымі Саветамі дэпутатаў або па іх даручэнні за мясцовымі выканаўчымі або распарадчымі органамі замацоўваецца права вызваляць грамадзян ад выплаты збору ў сувязі са знаходжаннем у цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Улічваючы неабходнасць дадатковага ўдакладнення пераліку асоб, якім належыць выплаціць збор за 2015 год з улікам прадугледжаных дэкрэтам змяненняў, тэрмін накіравання падатковымі органамі паведамленняў плацельшчыкам збору перанесены з 1 лістапада 2016 года на 20 студзеня 2017 года, а тэрмін выплаты збору — з 1 снежня 2016 года на 20 лютага 2017 года.

# ПРА СЛЕДСТВА — ПАСЛЯДОЎНА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Следчага камітэта Івана Наскевіча.**

«У хуткім часе мы правядзём нараду па выніках мінулага года па ўсіх праваахоўных блоках, запрасіўшы і судовую галіну ўлады, з мэтай абазначэння і разгляду пытанняў, якія знаходзяцца ў мяне на кантролі, пачынаючы з рэфармавання судова-следчай сістэмы ў цэлым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заслухаў даклад аб асноўных выніках работы Следчага камітэта ў 2016 годзе, у тым ліку аб аптымізацыі, якая праводзіцца ў ведамстве. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся вынікамі расследавання найбольш рэзанансных крымінальных спраў.

Асаблівая ўвага была звернута на неабходнасць раскрыцця спраў, якія цяпер знаходзяцца ў распрацоўцы Следчага камітэта, у прыватнасці, жорсткага забойства бізнесмена ў Беразіно. «Гэта пытанне гонару. Я папярэджваў і кіраўніка МУС: ён паабяцаў раскрыць гэтую крымінальную справу. Вы павінны звяртаць увагу на падобныя справы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Таксама было даложана аб ходзе расследавання крымінальнай справы, распачатай у дачыненні да мінчаніна, які здзейсніў напад на міліцыянера ў навагоднюю ноч, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ніхто не мае права аказваць супраціўленне супрацоўнікам міліцыі і тым больш ужываць у дачыненні да іх гвалт, паколькі гэта можа пацягнуць у тым ліку выкарыстанне праваахоўнікамі зброі — безумоўна, у межах заканадаўства.

На сустрэчы было адзначана, што ўзровень злачыннасці ў Беларусі зменшыўся ў мінулым годзе на 4,5%. Скарацілася і колькасць спраў, па якіх былі вынесены апраўдальныя прысуды з-за допушчаных следчымі парушэнняў крымінальна-працэсуальнага заканадаўства.

# У канструктыўным рэчышчы

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і прэзідэнт, старшыня праўлення ПАТ "Ашчадбанк" Герман Грэф абмеркавалі на сустрэчы ў Мінску далейшае развіццё супрацоўніцтва ў банкаўскім сектары.**

«Нашы банкаўскія справы — тыя пытанні, аб якіх мяне падрабязна інфармаваў Васіль Мацюшэўскі (першы віцэ-прэм'ер Беларусі), да гэтага мы абмяркоўвалі ва ўрадзе — там разуменне знойдзена», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Але я хачу сказаць галоўнае: калі Герман Оскаравіч будзе ставіцца, працуючы ў Беларусі, да нашых партнёраў, кліентаў, якія з банкам супрацоўнічаюць, так, як у Расіі да расійскіх, у нас ніколі не будзе пытанняў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, ён добра інфармаваны аб пазіцыі Германа Грэфа на расійскім полі дзейнасці і чуў у гэтым плане шмат добрага.

У сваю чаргу Герман Грэф падзякаваў асабіста Прэзідэнту, а таксама ўраду, Нацыянальнаму банку Беларусі за тое, што ў складаных сітуацыях, якія ўзнікалі ў 2015 і 2016 гадах, была знойдзена канструктыўная падтрымка і выхады. «Гэты год таксама будзе не вельмі просты, але ўжо значна лепшы, чым 2016-ы. А з 2018 года мы разлічваем пачаць ужо нармальную работу тут. Вітаючы выказванае ажыўленне і крэдытавання, і нашага партфеля актываў», — сказаў ён.

У цэлым на сустрэчы абмяркоўваліся вынікі і пытанні ўзаемадзеяння ў 2016 годзе, а таксама планы і перспектывы да канца 2018 года, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Гаворка ідзе аб рэалізацыі ў Беларусі шэрагу праектаў, у тым ліку па стварэнні лічбавай экасістэмы і доступу кліентаў да сучасных сэрвісаў і паслуг. Бакі таксама дамовіліся аб падыходах па дафінансаванні некаторых праектаў.

■ Добрыя справы

# Кніжны баль завітаў у Шклоў

## Сабраныя ад продажу кніг на дабрачынным аўкцыёне сродкі перададзеныя дзецям з парушэннямі зроку



Фота БЕЛТА.

**Калядны дабрачынны баль кнігі, які адбыўся ў снежні ў Мінску, прыгожа завяршыўся ў Шклове. Сабраныя падчас яго сродкі атрымала Шклоўская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі зроку. Сертыфікат на суму каля шасці тысяч рублёў дырэктару ўстановы Інзе Аляксандравай уручыла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ. Калядны дабрачынны баль кнігі, арганізатарам якога з'яўляецца Міністэрства інфармацыі, — частка вялікага дабрачыннага свята пад назвай «Нашы дзеці». Гэты праект праводзіўся напярэдадні Новага года ўжо 5-ы раз.**

У інтэрнаце жывуць і вучацца 90 дзяцей з Магілёўскай і Віцебскай абласцей. І хаця ў большасці з іх сур'ёзныя праблемы са зрокам, кнігу тут любяць і паважаюць. Дзеці з задавальненнем чытаюць па Брайлі і вельмі цесна працуюць з камп'ютарнымі варыянтамі кніг.

— Выдаўцам трэба ўзяць на заметку, што ёсць патрэба ў адукацыйнай літаратуры для такіх вось спецыялізаваных устаноў, — адзначыла міністр, заўважыўшы, што летась у краіне было выдадзена 20 найменняў кніг па Брайлі.

Шклоўская школа-інтэрнат была выбрана для дабрачыннасці не выпадкова. Менавіта Магілёўшчына ініцыявала летась стварэнне ўнікальнага кніжнага праекта «Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку». Таму ўсе грошы, сабраныя падчас балю, вырашана было перадаць адной з устаноў вобласці.

Падчас наведвання школьнай бібліятэкі з боку дырэктара ўстановы прагучала жаданне купіць для патрэб навучэнцаў электронны павелічальнік. Адзін тут ужо ёсць, але гэтага недастаткова. Лілія Ананіч падтрымала гэтую прапанову. Тым больш што дабрачынныя грошы якраз і прызначаюцца для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы школы-інтэрната.

— Беларусь далучылася да Канвенцыі па правах інвалідаў і робіць усё магчымае, каб такія ўстановы, як Шклоўскі дом-інтэрнат, маглі развівацца. Трэба больш увагі ўдзяляць рэгіёнам, цікавіцца іх патрэбамі, — заўважыла міністр.

У якасці падарунка дзеці таксама атрымалі літаратуру, у тым ліку і па Брайлі, і аўдыякнігі. У іх была магчымасць задаць пытанні пісьменнікам Алесю Бадаку, Алене Стэльмах і іншым.

Міністр інфармацыі таксама наведала рэдакцыю шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт». Яна высока ацаніла вопыт работы гэтай установы.

— Мне падабаецца, як развіваецца раённая прэса, — падкрэсліла яна. — Растуць яе тыражы, папулярнасцю карыстаецца інтэрнэт-версія. Наогул, на базе рэдакцыі рэалізуецца добры мультымедыйны праект, які дазваляе вырашаць шматлікія пытанні. Тут адначасова функцыянуюць газета, сайт і тэлестудыя. Гэты перадавы вопыт трэба браць на ўзбраенне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Наша пазіцыя

# Пазбавіцца ад лішняга і працаваць

## Міністр замежных спраў пра развіццё Садружнасці

**Беларусь выступае за далейшае развіццё інтэграцыйных працэсаў у Садружнасці Незалежных Дзяржаў і прыняцце рашэнняў, якія прынясуць канкрэтную аддачу. Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ.**

«Беларусь заўсёды выступала за тое, каб СНД развівалася і мацнела. Мы заўсёды падтрымлівалі развіццё інтэграцыйных працэсаў, — сказаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — У Садружнасць сёння ўваходзяць каля дзесяці дзяржаў з рознымі інтарэсамі, знешнепалітычнымі і знешнеэканамічнымі мэтамі. Але тым не менш мы знайшлі сілы, каб разам вырашаць агульныя праблемы і выклікі, якія пастаянна ўзнікаюць».

На думку Уладзіміра Макея, галоўная задача на найбліжэйшую перспектыву — зрабіць СНД больш моцнай і запатрабаванай. Таму на сустрэчы Савета кіраўнікоў дзяржаў і было прынята рашэнне аб адаптацыі СНД да сучасных рэалій. «Мы павінны аптымізаваць нашу структуру, дагаворна-прававую базу», — сказаў міністр. Ён таксама дадаў, што неабходна «скасаваць тыя дакументы, якія не працуюць, і пакінуць тыя, што прыносяць карысць».

Пры гэтым міністр падкрэсліў: «Беларусь ніколі не была і не стане магільшчыкам інтэграцыйных працэсаў на прасторы СНД». «Мы выступаем за тое, каб інтэграцыйныя працэсы развіваліся, умацоўваліся і прыносілі канкрэтную аддачу. Трэба менш займацца галаслоўнымі заявамі, а прымаць рашэнні, якія прынясуць канкрэтную аддачу ў дзейнасці СНД», — заявіў кіраўнік МЗС.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# ІЗНОЎ АБ ПРАВІЛАХ ПРЫЁМУ

## Хто зможа паступаць на вострадэфіцытныя спецыяльнасці без экзаменаў?

**Пра асноўныя новаўвядзенні будучай прыёмнай кампаніі — магчымасць здачы абітурыентамі ВНУ чатырох тэстаў, падаўжэнне тэрміну дзеяння сертыфікатаў ЦТ на два гады і льготы пры паступленні для выпускнікоў профільных педагагічных класаў — «Звязда» паведамляла раней. А што зменіцца для абітурыентаў, якія плануюць паступаць не ў ВНУ, а ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы?**

— Для выпускнікоў базавай і сярэдняй школы, якія спыняцца на атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі, спрашчаюцца некаторыя ўмовы, — тлумачыць **начальнік упраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандр ЛАШУК.** — Раней у дачыненні да часткі з іх распаўсюджвалася абмежаванне — ім трэба было мець у атэстаце мінімум 4 балы па рускай (беларускай) мове і профільным прадмеце. Зараз абмежаванне ў дачыненні да рускай (беларускай) мовы знятае, яно засталося толькі па профільным прадмеце. Новаўвядзенне распаўсюджваецца на выпускнікоў 9-х класаў, якія будуць паступаць на спецыяльнасці, па якіх конкурс у мінулым годзе склаў 3 і больш чалавек на месца, а таксама на адзінаццацікласнікаў пры паступленні на спецыяльнасці з конкурсам у 2016 годзе — 1,5 і менш чалавека на месца. Гэта асабліва актуальна для людзей, якія даўно скончылі школу, але хацелі б атрымаць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Новымі правіламі прыёму таксама **прадугледжана дадатковая магчымасць для маладых людзей стаць навучэнцамі ССНУ:** выпускнікоў 11-х класаў, якія не прайшлі ў бягучым годзе па конкурсе, па іх жаданні могуць залічыць на вакантныя месцы ў групы на базе 9-х класаў, набраныя год таму. Але гэта будзе магчымым толькі пры ўмове, калі ў такіх групах ёсць вакантныя месцы. Акрамя таго, для выпускнікоў сярэдняй школы, якія паступаюць у ССНУ, прадугледжана магчымасць здачы трох прадметаў на ЦТ, хоць прыёмнай камісіяй будуць брацца пад увагу ўсё роўна толькі два сертыфікаты. Гэта было зроблена для таго, каб пашырыць магчымасць выбару сярод спецыяльнасцяў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што тычыцца абітурыентаў ВНУ, то іх, безумоўна, павінны зацікавіць наступныя новыя моманты, якія з'явіліся ў правілах. **Пераможцы міжнародных і рэспубліканскай алімпіяд** па вучэбных прадметах (уладальнікі дыпломаў I, II і III ступеняў) змогуць паступаць без экзаменаў на найбольш запатрабаваныя эканамікай спецыяльнасці, дзе гэты прадмет вызначаны другім прадметам профільных выпрабаванняў. Пералік такіх спецыяльнасцяў будзе ўстанаўлівацца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам эканомікі.

Таксама без экзаменаў на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці змогуць паступаць **пераможцы (дыпломы I, II і III ступеняў) трэцяга (абласнога і мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, школьныя медалісты і ўладальнікі дыплома аб заканчэнні прафесійна-тэхнічнай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай.** Пералік спецыяльнасцяў устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

Асобам, якія маюць дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці "Лячэбная справа" з адзнакай і паступаюць у ВНУ на спецыяльнасці «Лячэбная справа» і «Педыятрыя», будзе выстаўляецца вышэйшы бал па профільным прадмеце «Біялогія».

Пераможцы (дыпломы I ступені) трэцяга (абласнога і мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі атрымаюць вышэйшы бал па профільнаму вучэбнаму прадмету «Гісторыя Беларусі» ці «Сусветная гісторыя» (па выбары абітурыента).

Пераможцы (дыплом I ступені) трэцяга (абласнога і мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы і астраноміі могуць разлічваць на вышэйшы бал па профільным прадмеце «Фізіка».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*



■ Сезон прастуд

# ГРЫП ТАКСАМА БЫЎ НА КАНІКУЛАХ

## Захваральнасць на вострыя рэспіраторныя захворванні і грып знаходзіцца на ўзроўні, характэрным для гэтага часу, а дакладней, на нізкім

**Выяўляюцца ў першую чаргу адэнавірусы і некаторыя іншыя, у тым ліку адзінкавыя выпадкі віруса грыпу А (H3N2) і В. Піка захваральнасці будзем чакаць, па традыцыі, у канцы студзеня — пачатку лютага. Сітуацыя пакуль нічым не адрозніваецца ад некалькіх папярэдніх гадоў, калі нават ніводная школа не закрывалася ў сувязі з павелічэннем выпадкаў інфекцыі. Паводле слоў кіраўніка Нацыянальнага цэнтра па грыпе РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталлі ГРЫБКОВАЙ, вірус грыпу А (H3N2) упершыню прыйшоў у цыркуляцыю яшчэ ў 1968 годзе і з таго часу нікуды не знікаў, адзінае, што пастаянна мяняўся. Кантроль за распаўсюджваннем захваральнасці ажыццяўляецца ў 18 гарадах, дзе пражываюць 53 працэнты насельніцтва. Звесткі збіраюць эпідэміялагічныя дазорныя цэнтры.**

Як высвятляецца, першыя ў гэтым сезоне захварэлыя на грып праігнаравалі вакцынацыю. Раскайвацца позна, неабходна вытрымліваць пасцельны рэжым, каб не нанесці арганізму яшчэ больш значную шкоду, звязаную з ускладненнем якога-небудзь хранічнага захворвання. Як толькі мы слабеем пад націскам вірусаў, ажыўляюцца следам і мікробы, а там і да пнеўманіі недалёка, а то і да лятальнага канца. Здаецца, якія яшчэ аргументы патрэбны ў падтрымку вакцынацыі ад адной з самых сур'ёзных інфекцый? Тым не менш сёлета зноў прышчапіліся каля 40 працэнтаў насельніцтва (таксама няблага, але ў гэтым выпадку чым больш, тым лепш), у тым ліку дзяцей.

«Працэс вакцынацыі дзяцей ідзе досыць цяжка, нягледзячы на ўсю асветніцкую работу, — кажа намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іна КАРАБАН. — Вакцынацыя не выкараняе грып, але дакладна зніжае цяжкасць працякання захворвання — без высокай тэмпературы, тым больш, без сур'ёзных ускладненняў. Арганізм лягчэй з ім спраўляецца. Але мы чамусьці слухаем суседку, якая вырашыла, што ў яе сям'і ўсе прышчапіліся і паляглі ад грыпу. Інфекцый шмат, у тым ліку падобных на грып. Немагчыма вось так проста паглядзець на чалавека і паставіць яму дыягназ грыпу».

Прышчэплівацца ўжо позна, а вось аптымальныя мінімальныя меры засцярогі ніхто не адмяняў і для вакцынаваных у тым ліку. Часцей мыем рукі, праветрываем памяшканні, праціраем рабочыя сталы і дзвярныя ручкі. А вось глытаць пры першым чханні супрацьгрыпозныя прэпараты не варта. Наогул змагацца менавіта з вірусамі грыпу здольныя толькі інгібітары нейраменідазы, ужываць якія неабходна па рэкамендацыі ўрача. Бескантрольнае іх прымяненне здольнае зніжаць адчувальнасць нашага арганізма — накшталт таго, што мы маем сёння з антыбактэрыяльнымі лекамі. Тым не менш антывірусныя сродкі прадаюцца пакуль без рэцэпта, каб не зніжаць даступнасць у нейкіх экстранных выпадках, калі побач з'явіліся хворыя на грып і патрабуецца тэрміновая прафілактыка. А лепш за ўсё паралельна знайсці час і распытаць урача аб іх мэтазгоднасці ў такім варыянце.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Падпіска-2017

### Ты адно запомні, браце, Са «Звяздой» цяплей у хаце!

**Добрая навіна, асабліва для новых чытачоў, якія, магчыма, яшчэ не ведаюць, што, афармляючы падпіску на «Звязду» (праўда, на квартал альбо паўгоддзе), можна атрымліваць не толькі газету, але і каштоўныя прызы. У прыватнасці, на гэтыя навагоднія святы «Звязда» сваім падпісчыкам абяцала падарыць... сувязь, і слова сваё, вядома ж, стрымала.**

Учора, напярэдадні старога Новага года, адданыя сябры газеты Ларыса Антонаўна Філічонак, Таццяна Ерафееўна Мацкевіч і Міхаіл Максімавіч Літошык з дапамогай чароўнага звяздоўскага капелюша вызначылі новых уладальнікаў сямі мабільных тэлефонаў (вельмі зручных, дарэчы, для людзей пажылога ўзросту) і сучаснага планшэта, які не можа не зацікавіць моладзь. Прозвішчы шчасліўчыкаў — у заўтрашнім нумары «Звязды».

Тым жа, каму на гэты раз — і, магчыма, зноў — не пашчасціла, кароткае суцяшэнне: «Вы не выйгралі? Такой бяды, бо нічога ж і не прайгралі!» Ва ўсякім разе да вас пяць разоў на тыдзень будзе прыходзіць «Звязда» — газета вашых дзядоў і прадзедаў, родная на роднай мове, амаль стагадовая, са старонак якой і якраз на ваш адрас ужо, магчыма, гучала сардэчнае:

*Ты адно запомні, браце,*
*Са «Звяздой» святлей у хаце!*

А значыць, і цяплей. Ці не так?

■ Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ НАВАТ З ПЛЮСАМ

## Сіноптыкі прагназуюць, што чарговая хваля маразоў завітае да нас ужо на наступным тыдні

**Анамальныя маразы адпусцілі, таму тэмпературны фон у сярэдзіне тыдня наблізіўся да кліматычнай нормы. А ў найбліжэйшыя дні паступленне цёплых вільготных паветраных мас абумовіць пагаршэнне ўмоў надвор'я і далейшае павышэнне тэмпературы паветра, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**



Сёння ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег і мокры снег. Будзе слабы галалёд, а на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла. Вільготнае і ветранае надвор'е чакаецца і ў суботу. Амаль паўсюдна па краіне пройдзе снег, мокры снег, па паўднёвым усходзе чакаюцца працяглыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу, па Гомельскай вобласці — з дажджом. У некаторых раёнах прагназуецца наліпанне мокрага снегу, туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да мінус 5 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. У нядзелю тэрыторыя краіны застанецца ў полі паніжанага атмасфернага ціску і пад уплывам малаактыўных франтальных сістэм. На большай частцы пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. На дарогах будзе слізка. Уначы будзе падмарожваць да мінус 2—7 градусаў, а ўдзень — ад нуля да мінус 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першай палове наступнага тыдня ізноў стане халадней. У панядзелак у некаторых раёнах пройдзе кароткачасовы снег, будзе слабы туман, шэрань. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 3—10 марозу, пры праясненнях да мінус 12 градусаў, нават удзень будзе да мінус 7 градусаў. Прагназуецца, што ў наступныя двое сутак маразы яшчэ ўзмоцняцца. У аўторак у некаторых раёнах пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе дасягаць 5—12 марозу, а пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Удзень будзе ад мінус 2 да мінус 8 градусаў. У сераду на працягу сутак стане яшчэ на некалькі градусаў халадней.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Эпоха Рутэнкі

## Канец або працяг, але ў новым амплуа?

**Сёння ў французскім Руане беларуская гандбольная зборная правядзе свой стартавы матч на чэмпіянаце свету. На пляцоўцы Kindarena падапечныя Юрыя Шаўцова сустрэнуцца са зборнымі Чылі, Саудаўскай Аравіі, Харватыі, Германіі і Венгрыі. Напярэдадні маштабнай падзеі самы тытулаваны гандбаліст краіны, нязменны капітан зборнай Сяргей Рутэнка абвясціў аб завяршэнні сваёй спартыўнай кар'еры.**



У пачатку года ў СМІ сталі з'яўляцца навіны пра тое, што вопытны беларускі спартсмен падпісаў кантракт з катарскім клубам «Аль-Кіяда». Сяргей сапраўды праводзіў трэніроўкі з гэтай камандай на працягу двух тыдняў, аднак кантракт так і не быў падпісаны.

— Я выканаў усе ўзятыя на сябе абавязацельствы. Але, калі дайшла справа да падпісання папер, кіраўніцтва клуба вырашыла перагледзець фінансавыя ўмовы. Я іх не прыняў і ў выніку вярнуўся дадому, — расказвае Рутэнка-старэйшы.

Вядома, што акрамя катарскай каманды айчыннаму гандбалісту паступала на працягу паўгода шмат іншых прапаноў.

— Іх было каля дзесяці, але ўсе аднолькавыя. Большасць кіраўнікоў выходзілі на мяне з думкай, што Рутэнка сядзіць дома, нічым не займаецца і таму абавязкова ўхопіцца за любую прапанову. Пагадзіўся разглядзець варыянт з Катарам, таму што добра ведаю трэнера, які кіруе «Аль-Кіяда», ды і ў складзе ёсць хлопцы, з якімі я гуляў раней, добра знаёмы, таму думаў, што мне будзе там камфортна, — дзеліцца Сяргей.

Пасля вяртання дадому гулец вырашыў афіцыйна паведаміць аб завяршэнні кар'еры, сабраўшы айчынных журналістаў.

— У мяне былі праблемы са здароўем, але не магу сказаць, што яны паўплывалі на маё рашэнне. Не было стомленасці ад гандбола, але была стомленасць ад гэтых шматлікіх пераможных, неразбярыхі. Я разумею, што час у гэтым выпадку гуляе супраць мяне, таму прыняў такое рашэнне. Сёння я хацеў бы падзякаваць усім, хто прыклаў руку да майго станаўлення як спартсмена. Перш за ўсё краіне, Прэзідэнту, які вельмі шмат робіць для спорту, свайму першаму трэнеру, медыцынскім супрацоўнікам, якія на працягу кар'еры рабілі ўсё, каб я змог гуляць як мага больш. Асобнае дзякуй маёй жонцы і родным, якія былі ўвесь гэты час надзейным тылам. Ну і, вядома ж, нашай федэрацыі ў асобе Уладзіміра Канаплёва.

**Сяргей Аляксеевіч Рутэнка нарадзіўся 29 жніўня 1981 года, выхаванец мінскай школы гандбола. Выступаў за клубы: «Аркатрон» (Беларусь), «Гарэньэ», «Цэлэ» (Славенія), «Сьюдад-Рэаль», «Барселона» (Іспанія), «Лахва» (Катар).**

**Дасягненні**

- 4-разовы чэмпіён Славеніі
- 4-разовы чэмпіён Іспаніі
- 2-разовы пераможца Суперкубка Іспаніі
- 5-разовы пераможца Лігі чэмпіёнаў
- Найлепшы бамбардзір Лігі чэмпіёнаў (2004, 2005)
- 4-разовы пераможца Суперкубка Еўропы
- Сярэбраны прызёр маладзёжнага чэмпіянату Еўропы.

Разам з сям'ёй Рутэнка ў найбліжэйшы час плануе жыць у Беларусі. У роднай краіне ён займаецца новым бізнес-праектам, які пакуль трымае ў сакрэце, але дакладна кажа, што новая справа не звязана са спортам.

— Тым вопытам, які ў мяне ёсць у гандболе, я з задавальненнем буду дзяліцца, але пакуль не бачу сябе ў ролі трэнера або спартыўнага функцыянера. У той жа час, не кажу, што сыходжу з гандбола зусім, з задавальненнем буду трымаць кантакт і падтрымліваць федэрацыю, зборную, гульцоў.

Напрыканцы Сяргей успомніў самыя запамінальныя моманты сваёй кар'еры і расказаў пра тое, што так і засталося яго марай.

— Мне, на шчасце, давялося выступаць толькі ў дзвюх краінах, не даводзілася часта мяняць клубы. Але кожнае месца, дзе я працаваў, было для мяне новым этапам у жыцці. Вядома, асобна ў памяці стаіць маладзёжны чэмпіянат свету ў складзе зборнай Беларусі, дзе наша каманда змагла падняцца на п'едэстал. Я хацеў дамагчыся большых поспехаў са зборнай, але зрабіў усё, што мог, я аддаў больш за 100 працэнтаў сябе. Таму сёння сыходжу са спакоем, з чыстым сумленнем.

У маім жыцці пачынаецца новая старонка. Што гэты момант надыдзе, я ведаў ужо даўно, таму рыхтаваўся. Пачынаецца нешта новае, — адзначыў Сяргей.

**Старшыня федэрацыі гандбола Уладзімір КАНАПЛЁЎ:**

— Перш за ўсё я хачу падзякаваць Сяргею. Неаднаразова казаў і яшчэ раз паўтару, Рутэнка і Шаўцоў — два чалавекі, якія вывелі нашу зборную на топ-турніры. Не сакрэт, што Сяргею прапаноўвалі гуляць за зборную Іспаніі і за Славенію, і там, можа, умовы былі лепшыя, але ён усё ж выбраў родную краіну. Для нас сыход Сяргея са зборнай, вядома, вялікая страта, ён быў лідарам не толькі на пляцоўцы, але і за яе межамі.

Гэта чалавек, якога ведае ўвесь свет, таму мы плануем правесці развітальную гульню для Рутэнкі, дзе супраць зборнай Беларусі пазмагаецца зборная свету (у яе ўвойдуць гульцы, з якімі Сяргей Рутэнка выступаў на працягу ўсёй сваёй кар'еры).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

**УВЕДОМЛЕНИЕ**

**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Фрунзенский» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 03 февраля 2017 года в 16.00 со следующей повесткой дня:**

1. Принятие решения о крупной сделке. Подписание кредитного договора ОАО «Универсам Фрунзенский» с Белорусским Народным Банком.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, пр. Пушкина, 37, офис ОАО «Универсам Фрунзенский».

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 15.00 до 16.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет ОАО «Универсам Фрунзенский».

УНП 100135329

# КУПАЛА — ТОЙ, ХТО НАС ЯДНАЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Таму і на Купалаў год, калі мы адзначаем 135-годдзе класіка, многія ўскладаюць вялікія надзеі. Абавязкова выйдуць новыя кнігі, адкрыюцца старонкі лёсаў, знойдуцца прадметы, мы зноў перачытаем і перагледзім творы... Здаецца, нашы класікі самі спрыяюць такім знаходкам і адкрыццям, раз-пораз іх прапаноўваючы пільным даследчыкам. Тое, што гэты год будзе знакавым для ўсяго купалазнаўства, даказала ўжо першая імпрэза, што прайшла ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Тут разам з традыцыйнымі афіцыйнымі прамовамі, якія на гэты раз былі надзвычай шчырымі і эмацыйнымі, была прадстаўлена нечаканая знаходка, якую прывезлі з Масквы.



— На мой погляд, Год культуры яшчэ працягваецца — у выдатных імёнах, зорках нашай літаратуры, — зазначыў падчас адкрыцця года Купалы **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ.** — Янка Купала, чый псеўданім звязаны з Купаллем, як і гэтае летняе свята ў беларускім народным календары, займае адно з найярчэйшых месцаў на небасхіле нашай літаратуры. Для мяне Купала заўсёды быў прыкладам самаадданага служэння радзіме. Яго іпастась знакавая — як мастака, грамадскага, палітычнага дзеяча, які ў сваёй працы імкнуўся вярнуць краіне і народу пачэснае месца паміж іншымі народамі свету. Думаецца, варта клапаціцца пра тое, каб яго спадчына і запаветы заставаліся каштоўнымі не толькі для нашых сучаснікаў, але і нашчадкаў.

Да захавання памяці пра Янку Купалу з хваляваннем ставяцца не толькі нашы суайчыннікі, але і беларусы, якія жывуць у іншых краінах свету. Доказам таму — дзейнасць музея Янкі Купалы ў Пячышчах, непадалёк ад Казані, дзе класік некаторы час пражыў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Музей стаўся сапраўдным цэнтрам беларускай культуры, які, расказваючы пра паэта, яднае народы і садзейнічае больш блізкаму нашаму знаёмству. Цікава, што беларусы, якія жывуць у Расіі, таксама актыўна працуюць у галіне даследавання нашай культуры, яны час ад часу адшукваюць прадметы, звязаныя з постаццю знакавых асоб,



лёсам і спадчынай беларусаў. Так, падчас вечарыны адбылася прэзентацыя партрэта Янкі Купалы работы рускага мастака Івана Паўлава. Яго ў дар мінскаму музею класіка перадаў **старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Сяргей КАНДЫБОВІЧ.**

— Мне падаецца, што мы жывём у эпоху Янкі Купалы, бо фактычна кожны год для нас праходзіць пад зоркай песняра, пад знакам духоўнасці беларускага народа, — падкрэсліў Сяргей Львовіч. — Духоўнасць беларусаў пранізана любоўю да сучаснасці, трапяткім стаўленнем да гісторыі і ўпэўненасцю ў будучыні. Таму сіламі нашай нацыянальна-культурнай аўтаноміі мы стараемся рабіць свой унёсак у адраджэнне і развіццё розных аспектаў культуры беларусаў. Невядомы дагэтуль партрэт Янкі Купалы мы набылі летась у складзе лота ў Аўкцыённым доме ў Маскве. На вялікае шчасце і радасць, у ліку іншых гравюр мастака Івана Паўлава мы адшукалі і партрэт Купалы 1931 года.

Купалу шануюць таксама і сябры нашай краіны з розных куткоў свету. Таму цалкам лагічна, што 135-годдзе класіка будуць адзначаць у Літве, Латвіі, Грузіі, Украіне, Расіі, Славакіі, Польшчы, Ізраілі, ЗША, Францыі. Ужо ёсць папярэдняя дамоўленасць з мэрамі чатырох гарадоў Славакіі, дзе ў 1935 годзе бываў наш класік, аб установцы мемарыяльных дошак. **Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Валерый ВАРАНЕЦКІ** лічыць такую ўвагу міжнароднай супольнасці да імя Янкі Купалы значнай і апраўданай:

— Творы песняра сёння з'яўляюцца нашым нацыянальным гонарам, духоўнай спадчынай. Калі мы ў розных краінах расказваем пра Беларусь, многія ўспамінаюць пра Янку Купалу. І наадварот: калі гаворым пра Купалу — гаворым і пра Беларусь.

А вось **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК** разважаў пра ролю песняра ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў:

— Для Беларусі Янка Купала — не проста паэт. Разам з Якубам Коласам і Максімам



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ігар МАРЗАЛЮК, Валерый ВАРАНЕЦКІ і Анатоль БУТЭВІЧ.

Багдановічам ён узначальвае беларускі нацыянальны іканастас. Без іх няма новай беларускай літаратурнай мовы, разумення быцця нашага народа, асэнсавання яго самасці. Гэтыя людзі паўсталі пасля доўгага часу забыцця нашых традыцый і культуры, калі беларусаў спрабаваліператварыць у палякаў, рускіх. Янка Купала — адзін з тых, хто, працуючы ў самых неспрыяльных абставінах, здолеў паказаць высакасць беларускай душы, перамагчы духоўную мізэрнасць.

Ужо адкрыты мемарыяльныя дошкі песняру ў Вільнюсе, Рызе, беларускай школе ў Рызе нададзена імя Купалы, а летась памятны знак Купалу быў устаноўлены ў ізраільскім горадзе Ашдод, на плошчы, якая носіць імя паэта. Гэтыя знакі прысутнасці нашага класіка з'яўляюцца ў іншых краінах дзякуючы спрыянню Міністэрства замежных спраў, дыпламатычных прадстаўніцтваў Беларусі за мяжой, а таксама прадстаўніцтваў замежных краін у Беларусі. Дарэчы, Янка Купала ў 1972 годзе быў першым з беларускіх пісьменнікаў, хто «пераступіў» мяжу. Тады помнік песняру з'явіўся ў Нью-Ёрку. Пра гэта згадаў **пісьменнік, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры, член Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА Анатоль БУТЭВІЧ.**

Але, думаецца, пра нашага класіка варта часцей нагадваць і самім беларусам. Паказваць яго не толькі як змагара за самасць нашага народа, але і як эстэта, выкшталцонага шляхціча, які быў у свой час іконай стылю. Гэтую думку выказаў **старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА.**

Так, старт святкаванню года Купалы ўжо дадзены. Упэўнена, нас чакае мноства выдатных імпрэз, выдавецкіх праектаў, прысвечаных песняру. Але арганізатары пакуль не раскрываюць усіх карт:

— Юбілейны год толькі пачынаецца, — кажа **дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена ЛЯШКОВІЧ,** — але ўжо сёння магу адзначыць, што фестываль мастацтваў, які пройдзе ў чэрвені ў Славакіі, будзе прысвечаны нашаму паэту.

Нашы класікі ўмеюць здзіўляць. Паказваюць свае творы з нечаканага боку, з часам «высвятляюць» новыя сэнсы знаёмых фраз. Таму, Іван Дамінікавіч, ад вас мы таксама чакаем сюрпрызаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# СЯБРАВАЦЬ З ФІНАНСАМІ — З ШАСЦІ ГАДОЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

З пачатку існавання акцыі быў значна пашыраны фармат кнігі, у ёй з'явіўся слоўнік фінансавых тэрмінаў. Сёння кніга «Твае Першыя фінансы» — гэта яркае нацыянальнае выданне, якое выдатна дапоўніць бібліятэку пяцікласніка. «Мы спадзяёмся, што чытанне казак стане займальным заняткам для дзяцей, і многія для сябе знойдуць масу карысных звестак, якімі абавязкова захочацца падзяліцца з сябрамі, бацькамі і настаўнікамі», — сказаў намеснік старшыні праўлення Белаграпрамбанка Віталь Крук.

## Вучымся лічыць

Згодна з праведзеным маніторынгам насельніцтва па лініі прыкладных фінансаў мы з вамі сёння сталі амаль на 35% лепш разбірацца ў фінансавай матэматыцы, чым тры гады таму. Ужо больш свабодна падлічваем працэнты па дэпазітах і крэдытах, разбіраемся ў розных відах картак і спосабах аплаты. Цяпер людзі сапраўды сталі актыўней цікавіцца гэтымі пытаннямі, паведаміла карэспандэнту «Звязды» **начальнік аддзела фінансавай адукаванасці ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Беларусі Юлія САКОВІЧ.**

На яе думку, за гэты час яшчэ больш па банкаўскай тэматыцы падцягнуліся і нашы дзеці. Штогод у краіне праходзяць спецыялізаваныя алімпіяды па фінансавай адукаванасці для старэйшых класаў, дзе вучні паспяхова адказваюць на даволі сур'ёзныя пытанні. Школьнікі часам лепш разбіраюцца ў фінансавых нюансах і ведаюць адпаведныя нормы заканадаўства, чым дарослыя.

## Асобны ўрок ці факультатыў

Спадарыня Саковіч адзначыла, што Нацбанк падтрымлівае любыя ініцыятывы банкаў па лініі фінансавай адукацыі насельніцтва, аднак сёння яго галоўнай задачай з'яўляецца ўкараненне гэтай тэматыкі ў навучальны працэс школьнай праграмы на пастаяннай аснове, як гэта цяпер практыкуецца ў нашых суседзяў (у Расіі, Арменіі і Украіне).

**Спецыялісты рэгулятара рэкамендуюць не браць крэдыты пад уплывам эмацыянальнага парыву непасрэдна на пляцоўцы гандлёвых цэнтраў. Менавіта хуткія крэдытныя прадукты маюць самыя высокія працэнты, а таксама ў іх могуць існаваць і іншыя падводныя камяні.**

Цяпер спецыялістамі разглядаецца некалькі варыянтаў. Па-першае, сёння не выключаецца магчымасць увядзення асобнага прадмета падобнай спецыялізацыі, як гэта зроблена ва Украіне. Па-другое, разглядаецца магчымасць укаранення элементаў фінансавай адукацыі ў матэматыку (стварэнне задач з падлікам працэнтаў ці даходаў), гісторыю, грамадазнаўства і нават у літаратуру. «Мы прапануем, каб пры падрыхтоўцы новых падручнікаў улічваўся менавіта такі тэматычны кірунак», — кажа Юлія Саковіч. Зразумела, што асобны ўрок і новыя падручнікі — гэта толькі перспектыўная задача найбліжэйшых гадоў. Сёння больш рэальна разглядаць увядзенне пастаяннага факультатыва па спецыяльную фінансавую тэматыку, лічыць суразмоўніца. У Нацбанку гатовыя разглядаць любыя з гэтых варыянтаў і абавязкова будуць дапамагаць школам адпаведнымі папулярнымі матэрыяламі і кансультацыямі. А пакуль Нацбанк прапануе настаўнікам карыстацца сайтам адзінага інтэрнэт-партала фінансавай адукаванасці насельніцтва (http://fingramota.by), дзе ёсць шмат цікавых матэрыялаў. У гэтых артыкулах падрабязна расказваецца аб крэдытах, дэпазітах, страхаванні, падатках, а таксама даецца шмат розных практычных парад. Напрыклад, аб тым, на што трэба звяртаць увагу пры выбары таго ці іншага фінансавага прадукту і г.д.

## Не захапляцца крэдытамі і ўмець размяркоўваць

Цяпер кіраўніцтва Нацбанка лічыць, што першыя элементы фінансавай адукаванасці нашы дзеткі павінны атрымліваць у школах нават з шасці гадоў. Гэта патрабаванне часу. Галоўнай мэтай дзяржавы па лініі фінансавай адукаванасці насельніцтва з'яўляецца не толькі глабальны пераход краіны ў сістэму масавага выкарыстання безнаяўных плацяжоў. Таксама сур'ёзным кірункам з'яўляецца тэма правільнага складання персанальных фінансаў і планаванне асабістага бюджэту. Сучасны работнік павінен добра разбірацца ў новых банкаўскіх прадуктах, каб не памыліцца ў выбары, а часам і не трапіць у цяжкае фінансавае становішча.

**Сёння больш рэальна разглядаць увядзенне ў школах пастаяннага факультатыва па спецыяльнай фінансавай тэматыцы.**

Сёння Нацбанк асобна звяртае ўвагу на тэму спажывецкіх крэдытаў. Фінансавы рынак у нас адкрыты, таму тут дзейнічае і шмат розных сумесных банкаў з замежным капіталам. Нашы людзі павінны быць дастаткова адукаванымі, каб не трапіць у фінансавую пастку банкаўскіх структур. Спецыялісты рэгулятара рэкамендуюць не браць крэдыты пад уплывам эмацыянальнага парыву непасрэдна на пляцоўцы гандлёвых цэнтраў. Менавіта хуткія крэдытныя прадукты маюць самыя высокія працэнты, а таксама ў іх могуць існаваць і іншыя падводныя камяні. Юлія Саковіч лічыць, што ў сённяшні няпросты ў эканамічным сэнсе час людзі перад заключэннем крэдытных дагавораў павінны сто разоў падумаць і рэальна ацаніць свае фінансавыя магчымасці. Ім неабходна папярэдне ўзяць яшчэ не падпісаны дагавор дадому, каб у сям'і сумесна вывучыць усе пункты дакумента і цалкам зразумець сваю адказнасць.

Юлія Саковіч упэўнена, што першыя крокі ў свеце фінансаў дзеці павінны рабіць у сям'і. «Мы прапануем бацькам навучаць сваіх малых кіраванню грашыма паступова», — кажа яна. Напрыклад, вучням малодшых класаў лепш даваць невялікія сумы кішэнных грошай, але часта. Старшакласнікам трэба выдаваць ужо большыя сумы, але раз на месяц ці на два тыдні. У гэтым выпадку дзеці атрымаюць магчымасць прымаць самастойныя рашэнні па размеркаванні грошай і пачнуць больш асэнсавана кіраваць уласным бюджэтам.

## Грошы павінны працаваць

Спецыялісты банкаўскай сферы адзначаюць, што фінансава адукаваныя людзі менш схільныя верыць нейкім чуткам і страхам. Віталь Крук звярнуў увагу, што змена стаўкі рэфінансавання ўплывае не толькі на дэпазітны рынак. Былі асцярогі, што праз зніжэнне стаўкі рэфінансавання і адпаведна ставак па дэпазітах людзі перастануць несці грошы ў банкі, прызнаў намеснік старшыні Белаграпрамбанка. «Але мінулы год паказаў, што асцярогі былі марныя. Насельніцтва нясе грошы, і тэндэнцыі першых дзесяці дзён гэтага года паказваюць, што прытокі рублёвых дэпазітаў не зніжаюцца, а наадварот растуць», — паведаміў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

Ігар ПАЗНЯК:

# «ГАЛОЎНЫ Ў ВЫПУСКУ НАВІН — РЭПАРЦЁР»




**Галівудскія фільмы, героямі якіх з'яўляюцца тэлерэпарцёры, ужо паспелі стварыць пэўнага кшталту стэрэатып. Маўляў, найважнейшым складнікам поспеху ў гэтай прафесіі з'яўляецца ўменне ці, дакладней, удача амаль выпадкова (вядома, разам з аператарам) апынуцца ў правільным месцы ў правільны час. Так, нельга адмаўляць важнасці для рэпарцёра быць у цэнтры актуальных падзей, але ж у рэчаіснасці значэнне мае не толькі гэта. Пра сакрэты стварэння якасных выпускаў навін, уменне здзіўляцца, цікавіцца і заўважаць дробязі, а таксама важнасць «перазагрузкі» свядомасці мы сёння гутарым з дырэктарам дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання канала «СТБ», вядучым праграм навін Ігарам ПАЗНЯКОМ.**

**— Падводзячы вынікі мінулага года і многія вядомыя асобы, і простыя людзі на сваіх старонках у сацыяльных сетках згадвалі найперш негатыўныя падзеі, што адбыліся ў 2016-м. Тэракты, ваенныя канфлікты, аварыі... Ігар Аляксеевіч, вы ж фактычна кожны дзень працуеце з такімі страшнымі падзеямі, расказваеце пра іх. Ці складана бачыць пазітыў у жыцці свету і рабіць акцэнт на станоўчых момантах?**

— Мы звыкліся мысліць штампамі. Гэта ў пэўнай ступені характэрна і для нашай журналісцкай супольнасці. Напэўна, калі людзі думаюць пра кепскае, яны яго ж і прыцягваюць у сваё жыццё. Вось паглядзіце, калі надыходзіць высакосны год, ужо ў самым яго пачатку многія рыхтуюцца да найгоршага. Насамрэч у мінулым годзе было шмат і добрага. Магчыма, я як журналіст, які працуе ў навінах, ужо маю прафесійнае ўменне штодзень «перазагружаць» свядомасць. Але ўпэўнены, што летась многа было добрага. Нарэшце беларусы, як і жыхары многіх краін, маюць свае манеты, якія можна кінуць на шчасце ў мора, раку ці фантан, каб туды вярнуцца. Памятаю, калі я ўпершыню быў у Празе 10 гадоў таму, давялося кінуць з Карлавага моста ў Влтаву еўрацэнт, а ў мінулым годзе я туды чарговы раз вярнуўся і пакінуў беларускую капейку. З падзей на працы згадаю вельмі цікавую камандзіроўку ў Кітай.

**Калі б у мяне была магчымасць вярнуцца ў штодзённую рэпарцёрскую працу, я б з задавальненнем рабіў розныя рэпартажы. Не хачу рабіць адно і тое ж кожны дзень.**

***— Гледзіце ў будучыню з пазітывам?***

— А па-іншаму, напэўна, і нельга жыць. Варта думаць пра будучыню добра, марыць, што будзе лепш.

***— Вы ўжо згадвалі ўменне «перазагружаць» свядомасць ад навін пра падзеі, што адбыліся на працягу дня. Напэўна, для журналіста гэта вельмі важна, бо, увесь час працуючы з бясконцай колькасцю інфармацыі, лёгка згубіцца?***

— У кожнага свой рэцэпт. Дома, пасля працы, гляджу апошні эфір у 22.30 і пасля гэтага тэлевізар прынцыпова не гляджу. Часцей за ўсё ў непрацоўны час я яго толькі слухаю. Пры гэтым выбіраю праграмы, не звязаныя з навінамі, падзеямі. Напрыклад, люблю канал пра сабак. Так да наступнай раніцы мозг ачышчаецца ад згадак пра падзеі папярэдняга дня. У журналістаў, якія працуюць у праграмах навін, ёсць паняцце «інфармацыйны дзень», яго трэба пачынаць з чыстай ад адпрацаванай інфармацыі свядомасцю. Нават надзвычай непажадана ўжываць словы «ўчора», «напярэдадні», «пазаўчора».

***— Тэмпы работы ў праграмах навін параўнальныя хіба што з хуткасцю, якую забяспечвае інтэрнэт. Як тэлебачанню з ім канкурыраваць і заставацца цікавым?***

— Сапраўды, інфармацыйныя сайты ў інтэрнэце з'яўляюцца сур'ёзнымі канкурэнтамі іншым электронным СМІ. Але тут справа не толькі ў хуткасці. У кожнага са СМІ — ці гэта газета, тэлеканал, сайт — свая спецыфіка і свая аўдыторыя. Інтэрнэт-навіны дазваляюць хутка расказваць пра падзеі. Але ж спецыялізацыя выпускаў навін на тэлебачанні крыху іншая. Так, на працягу дня мы ў тэлеграфным стылі расказваем, што, дзе і калі адбылося. А ўжо вечарам разам з калегамі прадстаўляем рэпартажы пра падзеі, але ўжо паказваем іх праз сваё аўтарскае бачанне. Напрыклад, калі рабілі сюжэт пра тое, як цыклон Аксель прыйшоў на Беларусь, мы не проста выкладалі факты, але наш рэпарцёр сам узяў у рукі лапату і адкопваў машыну са снегу. Улетку, калі былі моцныя залевы, мы пасля здымкаў разам выціскалі ваду з адзення рэпарцёра. Хто з калег, якія працуюць на інтэрнэт-парталах, каб напісаць матэрыял, сам дае нырца ў непагадзь? А нашы карэспандэнты гэта робяць — каб расказаць, паказаць і падзяліцца ўражаннямі. У гэтым сэнсе тэлебачанню пакуль няма канкурэнтаў.

***— Вы ж і сам раней працавалі рэпарцёрам?***

— Калі надараецца магчымасць, я і сёння раблю рэпартажы.

***— Якія тэмы вам цікавыя? Пра што з задавальненнем расказваеце?***

— Я супраць раздзялення тэматычных калідораў паміж рэпарцёрамі. Напрыклад, калі карэспандэнт расказвае толькі пра навіны палітыкі ці культуры. Я быў рэпарцёрам у час, калі адбывалася будаўніцтва нашай новай Нацыянальнай бібліятэкі. Як кажуць, моцна «сядзеў» на гэтай тэме і перыядычна рабіў рэпартажы пра тое, што адбываецца на будаўнічай пляцоўцы. Праз некаторы час мой кіраўнік адзначыў, што я пачаў паўтарацца. Так, зразумела, сказаць новае і па-новаму пра тое, што ўжо некалькі разоў мной самім жа паведамлена, вельмі складана. Магчыма, іншы рэпарцёр новага не раскажа, але ў любым выпадку заўважыць нейкія дэталі і аспекты, зірне на іх сваімі вачыма. Калі б у мяне была магчымасць вярнуцца ў штодзённую рэпарцёрскую працу, я з задавальненнем рабіў бы розныя рэпартажы. Не хачу рабіць адно і тое ж кожны дзень. Сёння мне цікава было б паляцець на самалёце ў кабіне пілота, скокнуць з парашутам, а заўтра — расказаць пра важныя навіны палітычнага жыцця краіны. Вось тады працуеш з запалам, тады адчуваеш сябе сапраўдным рэпарцёрам. Гэта як новыя жыцці пражываць. Наша прафесія ўнікальная, яна дазваляе кожны дзень перажываць новыя сітуацыі. Сёння цябе дапусцілі ў аперацыйную, ты паўгадзіны мыеш рукі разам з хірургам, а заўтра — назіраеш за работай цэнтра кіравання палётамі.

***— Мне падаецца, што цікавіцца ўсім, быць вельмі дапытлівым — гэта таксама ўменне, якому трэба вучыцца. Хоць бы проста не ленавацца штодзень адкрываць новае.***

— Сапраўдныя рэпарцёры крыху вар'яты. У іх гараць вочы, яны неймаверна дапытлівыя, умеюць заўважаць і зазначаць дэталі. Рэпарцёр — той, хто гатовы ў любы момант панесціся на край свету.

***— А як ваша сям'я ставіцца да такой апантанасці працай?***

— Мае дачка і мама, напэўна, да канца не разумеюць, навошта я гэта ўсё раблю (смяецца). Насамрэч часцей за ўсё я не дома, а недзе на працы. А дачка перажыла чарговы перыяд, калі і сама захацела стаць журналістам, нешта пачынае пісаць. Сям'я на тое і сям'я: нават калі ім нешта не падабаецца, яны цябе зразумеюць. Зразумеюць, чаму я прыйшоў дадому не а шостай вечара, а бліжэй да поўначы.

***— Выпускі навін маюць досыць кансерватыўны фармат. Цяжка ўявіць іх без традыцыйных складнікаў. Ці лёгка быць крэатыўным у такіх жорсткіх рамках?***

— Кансерватыўнасць выпускаў навін — у пэўнай ступені міф. Так, навіны — гэта класіка, але цяпер на рынку электронных СМІ, тэлеканалаў досыць жорсткая канкурэнцыя, у якой трэба перамагаць. Хоцькі-няхоцькі будзеш шукаць новыя формы падачы матэрыялу. Цяпер мы спрабуем намацаць іншы фармат выніковай інфармацыйна-аналітычнай праграмы тыдня, якая на нашым канале так і называецца — «Тыдзень». Напрыклад, наўмысна выходзім са студыі, запісваем падводкі вядучых у розных месцах. Так, калі рабілі праграму, прысвечаную дэнамінацыі, нашы карэспандэнты выязджалі ў тыя мясціны, выявы якіх размешчаны на новых банкнотах. Хоць усё можна было зрабіць традыцыйна ў студыі на фоне дэкарацый. Калі была праграма, дзе расказвалі пра 25-годдзе распаду СССР, мы паехалі ў Белавежскую пушчу, у тое самае месца, дзе вырашаўся лёс краіны. Стараемся, каб рэпарцёры «прымервалі» на сябе сітуацыю, станавіліся ўдзельнікамі ці сведкамі падзей.

***— Дзе падглядаеце такія «фішкі»? Абапіраецеся на вопыт замежных калег?***

— Падглядаць у калег не вельмі правільна. У кожнага свой падыход. Больш таго, у замежных тэлеканалаў навін крыху іншы фармат. Там навіны выбудоўваюцца па дакладнай схеме, і за імі часцей за ўсё не відаць рэпарцёра. Такія навіны робяць журналісты. Гэта таксама складана, бо трэба хутка, дакладна, праўдзіва паведаміць пра падзею. А задача рэпарцёра крыху іншая, трэба яшчэ і «прымерыць» на сябе гэтую падзею. Галоўны ў выпуску навін — не вядучы, а рэпарцёр. Што да прыдумвання «фішак», то ў мяне свой рэцэпт. Я люблю пасля працы прайсціся па горадзе некалькі кіламетраў. За гэты час разглядаю ўсё вакол, абавязкова стаўлю перад сабой задачу чамусьці здзівіцца, думаю таксама, як бы я пра гэта расказаў гледачам. І расказаў так, каб мой рэпартаж запомніўся. У кожным рэпартажы, як вішанька на торце, павінна быць яркая, незвычайная дэталь. Калі з рэпартажу запамінаецца хоць нешта, на маю думку, гэта найлепшы крытэрый паспяховасці.

**Наша прафесія ўнікальная, яна дазваляе кожны дзень перажываць новыя сітуацыі, амаль новыя жыцці. Сёння цябе дапусцілі ў аперацыйную, а заўтра — ты назіраеш за работай цэнтра кіравання палётамі.**

***— Вы родам з Мёраў, што на Віцебшчыне. Я з задавальненнем паглядзела некалькі вашых вялікіх рэпартажаў з роднага горада. Складана было расказаць па-новаму пра тое, што знаёма з дзяцінства?***

— Гэтыя праекты нарадзіліся амаль выпадкова. Мы абмяркоўвалі падрыхтоўку сюжэта пра 500-годдзе Мёраў і планавалі туды накіраваць нашага карэспандэнта па Віцебскай вобласці. Але кіраўніцтва даведалася, што я сам нарадзіўся ў гэтым горадзе, таму іншых кандыдатур для вандроўкі і не прапаноўвалі. І праца мяне настолькі захапіла, што паехаўшы за пяціхвілінным рэпартажам, я вярнуўся з цэлым фільмам больш як на 20 хвілін. Так склаўся лёс, што я вельмі доўгі час не быў на радзіме, таму вяртанне ў родны горад для мяне сталася вяртаннем у той час, «калі дрэвы былі вялікімі». Я вельмі многае пабачыў па-іншаму, але і заўважыў, што многае ў добрым сэнсе засталося па-ранейшаму. Гэта мяне, напэўна, і натхніла на стварэнне фільма. І потым, ужо ў межах праекта «Я крочу па краіне», з задавальненнем зрабіў яшчэ адзін. Тым больш што ў родным горадзе сапраўды ёсць што паглядзець. Напрыклад, самую доўгую набярэжную ў Беларусі, зробленую з пліт узлётна-пасадачнай паласы ваеннага аэрадрома.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

## Аўторак, 17 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10** Актуальнае інтэрв'ю.
**9.30, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Шчаслівы білет».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.30** Дзень спорту.
**0.40 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.20 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.30 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 18.20 Дэтэктыў «Сёмая руна». 1-я серыя.**



**11.55, 16.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.50, 21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**13.20, 22.10** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**14.20, 20.25** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 0.00** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.05** «Як гартаваўся стайл 2». Сіткам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35** «Беларуская кухня». Халадзец.
**8.00, 11.40, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.35 «Фурцава». Драма. 1-я серыя.**
**9.10, 15.00 «Іван Фёдараў». Драма. 1-я серыя.**
**10.20** «Гітара па крузе».
**11.15** «Імгненне вечнасці». Раман у масках. Аб жыцці і дзейнасці Станіслава Аўгуста Панятоўскага, апошняга караля Рэчы Паспалітай.
**11.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.20** «Музеі Беларусі». Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.
**12.45, 23.25** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**13.10** «Гуляй, душа!» Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята».
**14.20** «Подых струн».
**16.15 «872 дні Ленінграда». «Апошні рубеж».**
**16.55, 21.40 «Дзяржаўная граніца». Серыял. «Афганская пастка».**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Выйсце ёсць». Тамара Гвердцытэлі.
**20.40** «Калыханка».
**21.05 «872 дні Ленінграда». «Фронту трэба — зробім!»**

### Беларусь 5

**8.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Харватыя — Беларусь.
**10.05** Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Дынама-Мінск».
**12.00** Баскетбол. Еўракубак. «Бней Герцлія» (Ізраіль) — «Цмокі-Мінск» (Беларусь).
**13.45** Біятлон. Кубак свету. Рупольдзінг. Спрынт. Мужчыны.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Рупольдзінг. Спрынт. Жанчыны.
**16.45** Хакей для ўсіх.
**17.15** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — СКА (Санкт-Пецярбург).
**19.15** Спорт-кадр.
**19.45, 22.45** PRO спорт. Навіны.
**19.55** Авертайм.
**20.25** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. «Спарта» (Чэхія) — «Векшэ Лейкерс» (Швецыя).
**22.55** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. «Фрыбург-Гатэран» (Швейцарыя) — «Фрэлунда» (Швецыя).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Фазэнда».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Грачанка».**
**22.40 Камедыя «Ч/Б».**
**0.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.15 «Next». Серыял.**
**12.25, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Дрэнны добры паліцэйскі».**
**15.55** «Іншая краіна». «Перу. Зямля інкаў».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.45** Дакументальны праект: «Душа ў спадчыну».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Маша ў законе».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20** Дак. фільм «Сямейныя драмы».
**14.20** Шоу «Няма праблем!»
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**19.20 Серыял «Закон і парадак».**
**22.15 Маст. фільм «Злачынны запал».**
**0.05 Маст. фільм «Таямнічая карта».**
**2.35 Серыял «Хто, калі не я?»**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Шаманка».**
**21.45, 23.30 Серыял «Скліфасоўскі».**
**23.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**0.35 Серыял «Саша добры, Саша злы».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10 Серыял «Адвакат».**
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.45** «Іх норавы».
**10.25 Серыял «Браценікі».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «За мяжой».
**14.15 Серыял «НС. Надзвычайная сітуацыя».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Павуцінне».**
**23.05** «НЗ.by».
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Вандраванні Сіндбада».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Трылер «Найлепшы стралок».**
**12.50 Серыял «Імперыя».**
**13.45 Драма «Зайздрасць багоў».**
**16.05, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.10** «Мультпарад».
**17.40 Серыял «Людзі ў дрэвах».**
**18.30 Серыял «Падмані мяне».**
**19.20 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Баявік «Рыцар дня».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**




## Паддай пары падкухціку з вяхоткай

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Ло́кшына** — выраб з пшанічнай мукі ў выглядзе тонкіх палачак цеста.

**Ката́х** — пачатак кукурузы.

**Падку́хцік (уст.)** — хлопчык, які служыў на кухні. Па-руску скажам — поварёнок.

У Я. Коласа чытаем: «Ты (Сымон) — падкухцік, ты — музыка, падмятай, ваданос».

**Вяхо́тка** — мачалка. Другое значэнне слова — абрэзкі тканіны, рыззё.

**Шу́ла** — слуп, на які падвешваецца створка варот.

**Штры́фель** — адварот на грудной частцы верхняга адзення. Па-руску — гэта той самы *лацкан*.

**Мароз па скуры** — так гавораць, калі апанавала моцнае пачуццё страху, хвалявання. Беларусы яшчэ скажуць: *валасы сталі дыбам, неба з аўчынку здалося*. Руская: *душа в пятки ушла, мурашки по коже пробежали*.

**Паддаць пары** — падбадзёрыць, натхніць каго-небудзь. Беларускі адпаведнік — *паддаць духу*. Рускі — *поддать жару*. К. Крапіва пісаў:

*...Свайго адзінай «конскай сіле»,*
*Якая й так напружвае*
*ўсё жылле,*
*Ён пугай пары паддае...*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.40** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 14.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Камедыя «Білет на VEGAS».
**11.20, 5.00** Серыял «Сакратар».
**12.20** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.20, 20.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».
**15.00, 2.00** Серыял «Дзетка».
**16.00, 3.00** Серыял «Нанакаханне».
**17.00, 23.00** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Меладрама «Ракавая красуня».
**23.30** Серыял «Месяц».
**0.30** «Не можа быць!»
**1.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Карціна». Маст. фільм. 1-я серыя.
**12.40, 20.50** «Правілы жыцця».
**13.10** «Пятае вымярэнне».
**13.40** «Антон Іванавіч сярдуе». Маст. фільм.
**15.10, 21.20** «Спадчына Старажытнай Азіі». Дак. серыял.
**16.05** «Сацi. Нясумная класіка...»
**16.50** «Астравы». Павел Коган і Людміла Станукінас.
**17.35** Віяланчэль. Майстры выканальніцкага мастацтва. Джавані Саліма і Барыс Андрыянаў.
**18.20** Колер часу. Жан-Эцьен Ліатар.
**18.30** «Бывай, ХХ стагоддзе! Уладзімір Набокаў».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**22.10** «Гульня ў бісер». «І.А. Бунін. «Міцна каханне».
**22.50** Колер часу. Анатоль Звераў.
**23.00** «Азарый Плісецкі. Жыццё робіць лепш, чым ты задумаў...»
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Казус Кукоцкага». Серыял.
**1.25** С. Рахманінаў. Саната №2 для фартэпіяна.
**2.00** — Прафілактыка на канале.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Гурт «Ногу свело». 1995 год.
**6.50** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Нашы комплексы». 1992 год.
**7.30, 11.35, 12.55, 14.20, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 2.30** Музычная настальгія.
**8.05** Праграма «Вясёлыя рабяты». 1985 год.
**9.20** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Міцькі». 2005 год.
**13.20, 19.15** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі».
**14.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Асаблівасці нацыянальнай эліты». 2006 год.
**20.25** «Ранішняя пошта». 1989 год.
**0.00** «КВЗ 87-88». Трэцяя сустрэча. Каманды НДУ і 1-га ЛМІ. 1-я частка.
**1.00** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**1.30** «Творчы вечар Аркадзя Арканава». 1990 год.
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**3.55** Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя».

### EuroSport 1

**3.00, 11.15, 17.45, 1.35** Тэніс. Australian Open.
**11.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс»-экстра.
**16.15, 2.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**16.45, 21.00** Тэніс. Матч дня. Выбар Матса Віландэра.
**22.00** Снукер. «Мастэрс».

### Кінакамедыя

**0.20** Камедыя «Жудасны Генры».
**2.00** Камедыя «Аксамітныя ручкі».
**3.45** Камедыя «Месяцавая афёра».
**5.30** Камедыя «Супер Лола».
**7.10** Меладрама «Законы прывабнасці».
**8.45** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**10.30** Прыгоды «Фантамас».
**12.20** Камедыя «Бармен».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Зноў».
**17.55** Камедыя «Закаханы і бяззбройны».
**19.30** Камедыя «Таксі-3».
**21.05** Камедыя «Таксі-4».
**22.45** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40, 14.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.05** «Доктар І...»
**8.35, 19.00, 2.40** «Асколкі». Серыял.
**10.05, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**15.25** «Здзелка».
**16.00** «Натуральны адбор».
**16.55, 21.30** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.40, 2.00** «Вяселле і развод».
**22.35, 5.30** «Гісторыі выратавання».
**23.05** «Звышнатуральнае». Серыял.
**23.50** «Рэальнае каханне». Драма.

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Драма «Джэры Магуаер».
**8.30** Фэнтэзі «Дзяўчына з вады».
**10.20** Драма «Непакораны».
**12.35** Меладрама «Кіт».
**14.15** Меладрама «50 першых пацалункаў».
**15.55** Трылер «Эфект матылька».



**20.10** Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
**0.30** Драма «Веранiка вырашае памерці».
**2.30** Меладрама «Найлепшае ўва мне».
**4.30** Трылер «Драйвер на ноч».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Пяць нявест».
**8.20** Драма «Мама».
**10.20** Камедыя «Каўказская палонніца!»
**12.15** Драма «Дзюба-Дзюба».
**14.45** Камедыя «Жаніх».
**16.35** Баявік «Адваротны адлік».
**18.35** Трылер «Адарванне».
**20.20** Трылер «Чыстае мастацтва».
**22.20** Камедыя «Руская гульня».
**0.20** Драма «No comment».
**2.25** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**4.25** Меладрама «Снежны анёл».

### National Geographic

**6.00, 13.10** Гульні розуму.
**6.25, 21.00, 0.05, 4.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 10.45, 14.40** Мегазаводы.
**8.25, 15.25, 22.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.10, 17.50** Антарктыка.
**10.00 1.00, 3.25** Паранармальнае.
**11.35, 16.15, 19.25, 23.20, 2.35** Расследаванні авіякатастроф.
**12.20, 18.35, 21.45, 1.45, 5.10** Марс.

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Зроблена з другаснай сыравіны.
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Цяга да матораў.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Калекцыянеры аўто.
**19.00** Аўтальянцы.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**1.00, 6.20** Выжыць пасля сэлфі.
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.

## ■ Тэлесеткі

## ТАТА МОЖА... ХАЙ ДАКАЖА!

**З 22 студзеня тэлеканал «Беларусь 2» прадставіць гледачам гумарыстычнае рэаліці-шоу — на бацькоўскае выжыванне ва ўмовах хатняй гаспадаркі.**



Праект украінскай вытворчасці, які носіць красамоўную назву «Тата трапіў», відавочна прыдумалі жанчыны, каб сагнаць моцны пол з канапы і даць пакаштаваць «лёгкага хлеба» звычайнай хатняй гаспадыні, жонкі і маці. Паводле ўмоў рэаліці-шоу, у кожным выпуску маці сямейства з'язджае ў тыднёвы водпуск, які цалкам прысвячае сабе, а бацька тым часам даглядае дзяцей і выконвае штодзённыя дамашнія справы, дакладна прытрымліваючыся графіка жонкі. Калі тату ўдасца справіцца з усімі заданнямі без таго, каб датэрмінова выклікаць жанчыну дамоў, сям'я атрымлівае грашовы прыз.

Паспачуваць або пакпіць з герояў рэаліці-шоу беларускія гледачы змогуць 22 і 29 студзеня, а з лютага — штодня з аўторка па пятніцу ў вячэрнім эфіры «Беларусь 2».

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

■

## Серада, 18 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10** Спецыяльны рэпартаж.
**9.30, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Шчаслівы білет».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.30** Дзень спорту.
**0.40 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.20 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.30 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 18.15 Дэтэктыў «Сёмая руна».**
**12.00, 16.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.50, 21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**13.20, 22.10** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоў.
**14.20, 20.25** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 0.00** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.05** «Як гартаваўся стайл-2». Сіткам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Каша-прысыпанка.
**8.00, 11.20, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Фурцава». Драма.**
**9.10, 15.00 «Іван Фёдараў». Драма, 2-я серыя.**
**10.25** «Гітара па крузе».
**11.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.05** «Наперад у мінулае».
**12.35, 23.25** «Дыя@блог». Пра прыгожае.
**13.05, 19.35 «Пастка». Драма.**
**13.50** Юбілейны канцэрт фальклорнага гурта «Купалінка».
**16.20 «872 дні Ленінграда». «Фронту трэба — зробім!»**
**16.55, 21.40 «Дзяржаўная граніца». Серыял. «Смяротны ўлоў».**
**20.40** «Калыханка».
**21.00 «872 дні Ленінграда». «У галодная пятлі».**

### Беларусь 5

**8.00, 21.55** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Спорт-кадр.
**8.35** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. «Спарта» (Чэхія) — «Векшэ Лейкерс» (Швецыя).
**10.30** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. «Фрыбург-Гатэран» (Швейцарыя) — «Фрэлунда» (Швецыя).
**12.25** Баскетбол. Еўраліга. ЦСКА (Расія) — «Мілан» (Італія).
**14.10** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Гомель».
**16.05** Чэмпіянат Беларусі па рукапашным баі.
**17.55** Баскетбол. Еўракубак. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Керменд» (Венгрыя). *(У перапынку — PRO спорт. Навіны.)*
**19.45** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Беларусь — Германія.
**21.25** Слэм-данк.
**22.05** Біятлон. Кубак свету. Рупольдзінг. Гонка праследу. Мужчыны.
**22.55** Біятлон. Кубак свету. Рупольдзінг. Гонка праследу. Жанчыны.
**23.45** Авертайм.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Фазэнда».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Грачанка».**
**22.40 Драма «Мой адзіны».**
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 23.55 «Next-2». Серыял.**
**12.25, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**1.25** Дакументальны праект: «Неўжывальныя здольнасці».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Раз на раз не прыпадае».**
**10.35 Маст. фільм «Злачынны запал».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Маст. фільм «Сямейныя драмы».**
**14.20** Шоу «Няма праблем!»
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**19.20 Серыял «Закон і парадак».**
**22.10 Маст. фільм «Грахі нашы».**
**0.00 Маст. фільм «Тры разгневаныя мужчыны».**
**3.15 Серыял «Хто, калі не я?»**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.55 Маст. фільм «Шосты».**
**9.30 Маст. фільм «Вам — заданне».**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Шаманка».**
**21.45, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі».**
**0.20 Серыял «Саша добры, Саша злы».**

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10 Серыял «Адвакат».**
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.45** «Іх норавы».
**10.25 Серыял «Браценікі».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «За мяжой».
**14.15 Серыял «НС. Надзвычайная сітуацыя».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Павуцінне».**
**23.05** «НЗ.by».
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Вандраванні Сіндбада».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Прыгоды «Вертыкальная мяжа».**
**13.00 Серыял «Імперыя».**
**13.55 Баявік «Рыцар дня».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**17.10 Серыял «Людзі ў дрэвах».**
**18.00 Серыял «Падмані мяне».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**19.20 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Брыджэт Джонс. Межы разумнага».**
**23.00 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.40** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 14.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Камедыя «Супернача».
**11.20, 5.00** Серыял «Сакратар».
**12.20** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.20, 20.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».
**15.00, 2.00** Серыял «Дзетка».
**16.00, 3.00** Серыял «Нанаканне».
**17.00, 23.00** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Меладрама «Каханне без перасадак».



**23.30** Серыял «Месяц».
**0.30** «Не можа быць!»
**1.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Карціна». Маст. фільм.
**12.45, 20.50** «Правілы жыцця».
**13.10, 18.15** Сусветныя скарбы.
**13.25, 23.50** «Казус Кукоцкага». Серыял.
**15.10, 21.20** «Спадчына Старажытнай Азіі». Дак. серыял.
**16.05** Штучны адбор.
**16.50** «Больш чым каханне». Ганна і Павел Флarэнскія.
**17.35** Віяланчэль. Майстры выканальніцкага мастацтва. Ёханэс Мозер.
**18.30** «Бывай, ХХ стагоддзе! Віктар Астаф'еў».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**22.10** Улада факта. «Павел І: адзінокі імператар».
**22.50** Колер часу. Альбрэхт Дзюрэр. «Меланхолія».
**23.00** «Азарый Плісецкі. Жыццё робіць лепш, чым ты задумаў...»
**23.45** Мастсавет.
**1.20** Ф. Мастранджэла і сімфанічны аркестр «Руская філармонія». Творы М. Равеля, М. дэ Фальі, А. П'яцолы.
**1.50** «О'Генры». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Міцькі». 2005 год.
**6.55, 8.20, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 18.55, 20.25, 21.40, 23.50, 1.30, 5.35** Музычная настальгія.
**7.20, 13.15, 19.20** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі».
**8.50, 20.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Асаблівасці нацыянальнай эліты». 2006 год.
**14.25** «Ранішняя пошта». 1989 год.
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.
**23.00** «Я сама». Тэма: «Маладая жанчына шукае працу». 1995 год.
**0.00** «Акулы пяра». Гурт «Ногу свело». 1995 год.
**0.50** Праграма «Тэма» з У. Ліцьевым: «Нашы комплексы». 1992 год.
**2.05** Праграма «Вясёлыя рабяты». 1985 год.
**3.20** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс».

### EuroSport 1

**3.00, 11.15, 17.45, 1.35** Тэніс. Australian Open.
**11.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матч»-экстра.
**16.15, 2.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матч».
**16.45, 21.00** Тэніс. Матч дня. Выбар Матса Віландэра.
**22.00** Снукер. «Мастэрс».

### Кінакамедыя

**0.25** Камедыя «Супер Лола».
**2.00** — Прафілактыка.
**10.00, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**10.45** Камедыя «Таксі».
**12.25** Камедыя «Таксі-2».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... На вяселлі».
**17.40** Камедыя «Закахаць і абясшкодзіць».
**19.40** Меладрама «Каханне з першага погляду».
**21.10** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».
**22.55** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-3».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 15.00** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.15** «Доктар І...»
**8.45, 18.55, 2.35** «Асколкі». Серыял.
**10.10, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.55** «Сляпая».
**12.55** «Варажбітка».
**14.00** «Паралельны свет».
**15.30** «Здзелка».
**15.55** «Натуральны адбор».
**16.50, 21.45** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**20.45, 1.40** «Магазіна».
**22.45, 5.30** «Лінія абароны».
**23.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.00** «Людзі Ікс-4». Фантастыка.

### ТБ1000

**6.10, 17.55** Драма «Абуджэнне».
**8.25** Трылер «11.14».
**9.55** Драма «Вераніка вырашае памерці».
**11.45** Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
**14.15** Трылер «Драйвер на ноч».
**15.55** Меладрама «Найлепшае ўва мне».
**20.10** Фантастыка «Гадзіла».
**22.40** Драма «Настаўнік на замену».



**0.25** Драма «Там, дзе сэрца».
**2.35** Дэтэктыў «Перш чым я засну».
**4.10** Трылер «Страчаны рай».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Руская гульня».
**8.20** Трылер «Чыстае мастацтва».

**10.15** Драма «No comment».
**12.20** Фантастыка «Дазнанне пілота Піркса».
**14.20** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**16.20** Меладрама «Снежны анёл».
**18.25** Драма «Сын».
**20.20** Драма «Якая бяжыць па хвалях».
**22.50** Камедыя «Рыба-мара».
**0.45** Фільм жахаў «Юлечка».
**2.45** Меладрама «Уцячы, дагнаць, закахацца».
**4.35** Драма «Як падняць мільён. Споведзь Z@drota».

### National Geographic

**6.00, 13.05** Гульні розуму.
**6.25, 9.55, 17.40, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 10.40, 14.35** Мегазаводы.
**8.20, 15.20, 22.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.30, 16.10, 19.25, 23.20, 2.25** Расследаванні авіякатастроф.
**12.15, 18.35, 21.45, 1.35, 4.45** Марс.
**21.00, 0.50, 4.00** Золата Юкана.
**0.05, 3.15** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Зроблена з другасной сыравіны.
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00 16.00, 20.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на складзе.
**11.00** Бітва за нерухомасць.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Паляўнічыя на складзе.
**19.00** Ліквідатар.
**1.00, 6.20** Выжыць пасля сэлфі.
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Воля плюс мэтанакіраванасць, плюс арганізатарскія здольнасці — немінучы поспех. Дзякуючы сваёй працаздольнасці вы можаце дасягнуць небывалых вышынь. Ёсць небяспека занадта захапіцца нязбытнымі марамі, што адарве вас ад рэальнасці і не дазволіць вырашаць надзённыя праблемы. Да канца тыдня паспрабуйце знайсці час для блізкіх. Субота — найбольш прыдатны дзень для хатніх клопатаў. У асабістым жыцці неабходна перапынак у адносінах, каб прыняць некаторыя важныя для сябе рашэнні.

**ЦЯЛЕЦ.** Дынамічны тыдзень, так шмат падзей, што вам будзе проста не хапаць ні сіл, ні часу, каб за імі ўсачыць. У некаторых выпадках давядзецца літаральна разрывацца, каб паспець усюды. Можа ўзнікнуць адчуванне, што ад вас занадта шмат патрабуюць і занадта мала даюць. У першай палове тыдня неабходна старанна выконваць прафесійныя абавязкі, пераадольваючы таемнае супраціўленне некаторых калег. Чацвер і пятніца — спрыяльныя дні для таго, каб заняцца кар'ерай. Не забывайцеся пра ўплывовых заступнікаў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Прыйдзецца ўраўнаважваць некаторыя рысы свайго характару, каб дамагчыся вызначаных мэт і не паўтарыць памылак нядаўняга мінулага. Зможаце атрымаць менавіта тое, чаго даўно хацелі. Так што будзе нагода для радасці. У выхадныя дні адпачыць ад праблем атрымаецца толькі дома, таму, калі на гэты дзень намечаны сустрэчы, іх пажадана адкласці. Калі, вядома, вы не хочаце вырашаць чужыя праблемы. З матэрыяльнага пункта гледжання — час даволі паспяховы. Можаце разлічваць на фінансавыя паступленні, стабільнасць у справах і з'яўленне новых магчымасцяў для заробку.

**РАК.** Вас могуць чакаць новыя знаёмствы і цікавыя сустрэчы. З самага пачатку тыдня будзьце на ўсялякі выпадак гатовыя да таго, каб памяняць работу і кола зносін. У чацвер на першы план выйдуць не словы, а ўчынкі: менавіта па іх варта ацэньваць навакольных. У пятніцу можа накрыць хваля раздражнення: паспрабуйце не рабіць занадта ўжо гучных скандалаў. Калі вас чакае гутарка або экзамен, вы пройдзеце іх паспяхова. Так што ў выхадныя будзе што адзначыць з блізкімі людзьмі.

**ЛЕЎ.** У пачатку тыдня трэба будзе заняцца рашэннем старых праблем і завяршэннем спраў, пачатых яшчэ ў мінулым годзе. У аўторак будзьце асцярожныя, вас можа чакаць добра замаскіраваны падман. Пачынаючы з чацвярга, надыходзіць спрыяльны час для старту чагосьці новага і незвычайнага. Выяўляючы сябе з лепшага боку, набудзеце значнасць і аўтарытэт у вачах навакольных. Удалымі могуць быць планы і задумы, якія вы будзеце рэалізоўваць у суботу. У нядзелю пастаўцеся з увагай да праблем родных.

**ДЗЕВА.** На працы, якія б намаганні вы ні прыкладалі, істотных змен у вашым становішчы пакуль не прадбачыцца. Затое можаце паспяхова вырашыць праблемы з жыллём. У сераду смела разлічвайце на дапамогу сяброў або родных. У чацвер лепш не прымаць паспешлівых рашэнняў у асабістым жыцці. Неабходна будзе старанна прадумаць і аб'ектыўна ацаніць прапанову, якая паступіла вам. Субота парадуе цікавай інфармацыяй, якая дазволіць змяніць у лепшы бок стан спраў у сям'і.

## Апошні гігант

**Гіганцкая секвоя з тунэлем у ствале, якая расла ў амерыканскім штаце Каліфорнія, звалілася падчас моцнай буры і паводкі, паведамляе NPR.**



Загінулая секвоя лічылася адной з галоўных славутасцяў парку вялікіх дрэў Калаверас і была вядомая пад назвай «Хаціна першапраходца». Паводле ацэнкі спецыялістаў, узрост знакамітага дрэва складаў не менш за тысячу гадоў. Каля зямлі дыяметр яго ствала дасягаў 10 метраў. У 1880 годзе ў ствале секвоі прарабілі тунэль, праз які маглі праязджаць конныя падводы, а затым і аўтамабілі. У апошнія гады ўваходзіць у яго дазвалялася толькі пешым турыстам.

Фатаграфіі, апублікаваныя ў Facebook, сведчаць аб тым, што тысячагадовае дрэва расшчапілася ўнізе і ўпала. «Хаціна першапраходца» была апошняй каліфарнійскай секвояй з тунэлем у ствале. Іншае такое ж вядомае дрэва, якое знаходзілася ў Іасеміцкім нацыянальным парку, загінула падчас буры ў 1969 годзе.

## Канец 17-гадовай «каўбаснай спрэчкі»

**Вытворцы вэнджанай каўбасы з бельгійскага рэгіёна Валонія атрымалі верх над канкурэнтамі з Фландрыі ў спрэчцы аб статусе сваёй прадукцыі, а менавіта каўбасы, паведамляе газета La Derniere Heure.**

Еўракамісія ў хуткім часе аб'явіць аб выключным праве кампаній з Валоніі называць сваю каўбасу «Ардэнская». За гэтым прадуктам будзе замацаваны статус геаграфічна абароненай назвы. Згаданая каўбаса робіцца ў Ардэнах — гарыстай вобласці на паўднёвым усходзе Бельгіі. Яна неаднаразова атрымлівала залатыя медалі на аграпрамысловых выстаўках. Калі вытворцы гэтага прадукту падалі заяўку на прысваенне яму статусу абароненай назвы, гэта выклікала незадаволенасць іх канкурэнтаў — буйных кампаній з Фландрыі. На думку прадстаўнікоў гэтых арганізацый, ардэнскую каўбасу можна вырабляць і ў іншых рэгіёнах. Аднак бізнесменам з Валоніі ўдалося даказаць, што толькі яны валодаюць арыгінальнай рэцэптурай вэнджання сваёй прадукцыі. «Каўбасная спрэчка» цягнулася каля 17 гадоў.

## Халодная слодыч у кіламетр даўжынёй

**Кампанія Moo-ville Creamery з амерыканскага пасёлка Нэшвіл, штат Мічыган, прыгатавала самы доўгі сандэй (дэсерт з марожанага) і трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса, паведамляе Associated Press.**



Рэкордны дэсерт расцягнуўся на 1110 метраў. На яго выдаткавалі больш за 3200 літраў марожанага, каля 360 літраў шакаладнага сіропу, 172 банкі ўзбітых вяршкоў і 7200 ягад вішні, сцвярджае газета Muskegon Chronicle. Страву паўтара дня гатавалі каля 250 добраахвотнікаў. Трыма месяцамі раней самае доўгае марозіва зрабілі ў суседнім горадзе Лудзінгтан, штат Мічыган. Тады кампанія House of Flavors выявіла сандэй даўжынёй у 910 метраў. Паколькі Moo-ville Creamery паспела абысці канкурэнта да выхаду штогадовага выдання Кнігі рэкордаў Гінеса, афіцыйнае прызнанне атрымае толькі яе дасягненне.

**Іван КУПАРВАС.** *hvir@zviazda.by*

## Нядзеля, 22 студзеня

### Беларусь 1

**6.50 Меладрама «Бацькоўскі інстынкт». Заключная серыя.**
**8.30** Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-4».**
**10.50** «50 рэцэптаў першага».
**11.40** Спецыяльны рэпартаж.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10 Меладрама «Карункі».**
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50** Вакол планеты.
**16.35** Тайны следства.
**17.10 Меладрама «Хатняя работніца».**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Ніткі кахання».**

### Беларусь 2

**7.05 М/с «Сябры анёлаў».**
**7.35 Фільм — дзецям «Белая змяя».**
**9.05, 21.00** Тэлебарометр.
**9.10** «Нядбайнікі». Шоу.
**10.15** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**11.15 Камедыя «Аднакласнікі-2».**
**13.00 Серыял «Шчаслівыя разам-4».**
**14.50** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**16.00** «Універ-шэф».
**16.35 Анімацыйны фільм «Падводная братва».**
**18.05** Зразумець і абясшкодзіць.
**18.40 Баявік «Кідок кобры».**
**20.40** Два рублі.
**21.30, 22.05** «Тата папаў». Гумарыстычнае рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.10 Камедыя «Superнянь».**

### Беларусь 3

**7.30** «Беларуская кухня». Мяса ў цесце.
**7.55, 12.35, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.10 «Падмаскоўная элегія». Драма.**
**10.00** «Музеі Беларусі». Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок».
**10.25** «Наперад у мінулае».
**10.50** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45** «Выйсце ёсць». Тамара Гвердцытэлі.
**12.10** «Святыні Беларусі». Кафедральны касцёл Святога Францішка Ксаверыя, г. Гродна.
**12.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» Браслаўскі раён. 1-я частка.
**13.15** «Вечары ў Маладзечне». Гурт «Стары Ольса».
**14.20 «Бумбараш». Камедыя.**



**16.30** «Ты — мая мелодыя». Канцэрт.
**18.05 «Гарбун». Прыгоды.**
**19.45** «Апошні дзень». Васіль Шукшын.
**20.40** «Калыханка».
**21.05 «Татулі». Камедыя.**
**22.35** «45 гадоў разам. Дарогі артыстаў». Юбілейны канцэрт Алы Ёшпе і Стахана Рахімава.
**23.25** М/ф.

### Беларусь 5

**8.00, 21.45** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Эстафета. Мужчыны.
**9.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**11.45** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Масстарт. Жанчыны.
**12.50, 21.55** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Масстарт. Мужчыны.
**13.50, 15.25** Міні-футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу.
**16.35, 23.00** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Эстафета. Жанчыны.
**18.00** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 1/8 фіналу.
**19.55** Міні-футбол. Кубак Беларусі. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00** (з субцітрамі), **9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».**
**9.40** «Бесталковыя нататкі».
**10.00** «Пакуль усе дома».
**10.55** «Фазэнда».
**11.30** «Адкрыццё Кітая».
**12.05 Серыял «Анёл у сэрцы».**
**16.15** Навіны спорту (з субцітрамі).
**16.20** Эдвард Радзінскі. «Царства жанчын».
**18.20 Меладрама «Каханне прыходзіць ціха».**
**20.00** Контуры.
**21.05** «Кропля ў кроплю». Фінал.
**0.00 Трылер «У адзін бок».**

### СТБ

**6.05, 8.10, 11.40, 13.40, 20.25** «Дзень фантастычных гісторый».
**7.45** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30, 16.50** «Аўтапанарама».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**14.30, 1.25 Дэтэктыў «Увага! Усім пастам...»**
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**22.10 Маст. фільм «Джо і Макс».**
**0.10** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00, 8.55** М/ф.
**7.55** «Культ/Турызм».
**8.25** «Беларусь сёння».
**9.30** «Чаму я?»
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Самазванка».**
**13.45** «Зорка ў падарунак».
**14.15 Маст. фільм «Зайчык».**
**16.15, 22.00 Серыял «Маша ў законе».**
**21.00** «Разам».
**0.45 Серыял «Зоя».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Адзінота».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** «Пакой смеху».
**14.15** «Смяяцца дазваляецца».
**16.30 Маст. фільм «Час збіраць».**
**18.20, 21.45, 23.10 Маст. фільм «Нялюбая».**
**20.00** Весткі тыдня.
**23.20** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.55** «Іх норавы».
**9.25** Ядзім дома.
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**12.05** «Дачны адказ».
**13.10** «НашСпажыўНагляд».
**14.15** «Таксама людзі».
**15.05** НТБ-бачанне. «Георгій-перамаганосец». Частка 2.
**16.20** «Следства вялі...»
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.25 Маст. фільм «Забіць двойчы».**
**23.45** «Навуковае асярод-дзе».

### 8 канал

**9.00, 14.45, 19.10, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Серыял «Камісар Рэкс».**
**11.45 Серыял «Крушэнне Лаконії».**
**14.50 «Глядзім усёй сям'ёй». Фільм-казка «Аліса ў краіне цудаў».**
**16.40 «Глядзім усёй сям'ёй». Серыял «Адной ў казцы».**
**17.25 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**



**19.15 Драма «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Фантастыка «Гэты новы свет».**

### ВТБ

**6.00, 23.10, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.30** «Ералаш».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.50** М/ф «Фіксікі».
**9.10** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!»
**10.30** Серыял «Татавы дочкі».
**11.30, 0.50** «Турбаміксер».
**12.00** «Паспецъ за 24 гадзіны».
**13.00** Серыял «Атэль Элеон».
**15.00** Трылер «Чырвоны агні».
**17.10** Анімацыйны фільм «Рэальная вавёрка».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**21.00** Баявік «Кніга Ілая».
**0.00** Еўрапейскі покерны тур-нір.
**4.30** «Лаві момант».
**5.00** «Празорлівая».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Макараў». Маст. фільм.
**12.10** Легенды кіно. Жэрар Філіп.
**12.40** «Расія, любоў мая!» «Алтай. Свет гукаў і фарбаў».
**13.10** «Хто там...»
**13.40** «Вулканічная Адысея». Дак. фільм.
**14.35** «Што рабіць?»
**15.25** Геніі і ліхадзеі. Аляксандр Багданаў.
**15.55** Вечар-прысвячэнне Аляксандру Салжаніцыну. «Жыццё не па хлусні».
**17.00** «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
**18.30** Канцэрт Алега Пагудзіна. Вальс. Танга. Раманс.
**19.50** «Бібліятэка прыгод».
**20.05** «Затоічы». Маст. фільм.
**20.50** «Блізкае акружэнне» Марка Захарава.
**22.55** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Вольга Перацяцька, Аніта Рачвелішвілі ў оперы М.А. Рымскага-Корсакава «Царская нявеста». Пастаноўка Берлінскай дзяржаўнай оперы.
**1.35** «Шпіёнскія страсці». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Закінуты горад Шаўковага шляху».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1972. 2012 год.
**6.55, 8.45, 9.40, 11.45, 12.55, 13.35, 0.55, 2.40, 3.40** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Маналог».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**11.00** «Кінапанарама». «Юбілейны выпуск. 20 гадоў». 1982 год. 2-я частка.
**13.25** Дак. фільм «Сумленны фатограф».
**14.00** Дак. фільм «Дысідэнты».
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Старэйшы сын».
**18.10** «Акулы пяра». Юрый Антонаў. 1994 год.
**18.55** Тэлеспектакль «Ліка». Па п'есе Армена Зурабава. 1978 год.
**20.25** Канцэрт Уладзіміра Дзявятава. 2003 год.
**21.40** Маст. фільм «Звычайная гісторыя».
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». «Акварыум». Мы ніколі не станем старэйшымі». 1-я частка. 2007 год.
**1.15** Маст. фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».
**5.00** «Песня-82». 1-е аддзяленне.

### EuroSport 1

**3.00, 11.15** Тэніс. Australian Open.
**11.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс»-экстра.
**16.15, 2.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**16.45, 20.15** Біятлон. Кубак свету.
**18.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**19.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**20.45, 22.00** Снукер. «Мастэрс». Фінал.
**1.05** Зімовыя віды спорту.

### Кінакамедыя

**1.20** Камедыя «Блеф».
**3.00, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**4.00** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... На вяселлі».
**5.40** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Бацька нявесты».
**7.25** Прыгоды «Фантамас разбушаваўся».



**9.10** Камедыя «Госць».
**10.45** Камедыя «Таксі-3».
**12.20** Камедыя «Таксі-4».
**14.00** Камедыя «Бамбу».
**16.00** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**17.45** Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
**19.30** Камедыя «Краіна цудаў».
**21.00** Камедыя «Бос у гасцінай».
**22.50** Меладрама «Каханне з першага погляду».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.50** «Далёка і яшчэ далей».
**11.50, 2.35** «Тайны следства». Серыял.
**15.05** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.30** «Рэвізора».
**20.40** «Без падману».
**21.35** «Фарсаж». Баявік.
**23.35** «Асцярожна, махляры!»
**0.05** «Жарабец». Серыял.
**1.05** «Звышнатуральнае». Серыял.
**5.30** «Рыжыя».

### ТБ1000

**6.10, 17.35** Фантастыка «Гадзіла».
**8.40** Драма «Пах жанчыны».
**11.30** Драма «Хоць раз у жыцці».
**13.30** Драма «Трусіная нара».
**15.25** Драма «Там, дзе сэрца».
**20.10** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**22.10** Фантастыка «Дывергент».
**0.40** Драма «Станцыя «Фрутвейл».
**2.15** Меладрама «Яна».
**4.20** Драма «Монстр».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Мой тата — Барышнікаў».
**8.10** Баявік «Параграф 78».
**10.35** Камедыя «Усё ўключана-2».
**12.25** Прыгоды «Не бойся, я з табой!»
**14.05** Драма «Якая бяжыць па хвалях».
**16.30** Трылер «Юлечка».
**18.25** Трылер «Чыстае мастацтва».
**20.20** Меладрама «Сабака Паўлава».
**22.05** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**0.15** Драма «Арлеан».
**2.20** Меладрама «Восьмага сакавіка».
**4.20** Меладрама «Забарона».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00, 10.15, 12.35, 14.05, 16.25, 22.35, 0.10, 2.25, 4.00** Расследаванні авіякатастроф.
**17.55** Крытычная сітуацыя.
**18.45, 21.50** Другая сусветная вайна.
**19.30, 21.05** Секунды да катастрофы.

### Discovery

**8.00** Аляска: апошні рубеж.
**11.00, 7.10** Загадкі планеты Зямля.
**12.00, 21.00** Космас навывarат.
**13.00, 22.00** Узрываючы гісторыю.
**14.00** Скрозь кратовую нару.
**15.00** Жыццё сабак.
**16.00, 23.00** Залатая ліхаманка.
**17.00** Смяротны ўлоў.
**18.00** Паляўнічыя на склады.
**19.00, 1.00** Ліквідатар.
**20.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**0.00** Калекцыянеры аўто.
**2.00, 4.15** Бітва за нерухомасць.
**4.40** Будаўнікі караблёў-гігантаў.




## НЕ ПЛЮЙ У КРЫНІЦУ

...Не вам казаць, у горадзе людзі, бывае, гадамі дзверы ў дзверы жывуць і між сабою не знаюцца. На вёсцы ж якраз наадварот: там не паспееш пра нешта падумаць, — людзі кажуць: «Зрабіў!» І галоўнае, ведаюць, як, з кім, калі, навошта... Тут і дарадцы табе бясплатныя, і суддзі з адвакатамі, а ўжо колькі крытыкаў...

Міхась, значыць, на сваім падворку задумаў студню зрабіць. Па сённяшнім часе справа гэта вельмі затратная: у адны матэрыялы ён колькі грошай убухаў! Каб сэканоміць, каб лішняга майстрам не плаціць, тыдзень з сынам падземную частку капаў, цягаючы вёдры з глінай...

Далей ужо лягчэйшыя справы пайшлі: акуратны буданок наверсе паставілі, дзверцы падагналі, каб шчыльна зачыняліся, пафарбавалі ўсё, новае акаванае вядро павесілі.

Карацей, стараўся гэты гаспадар, каб усё ў яго па-людску было, каб служыла доўга.

І вяскоўцаў, вядома ж, слухаў. Тыя за час работы не раз падыходзілі, нешта падказвалі, раілі, павучалі — устаўлялі свае «пяць капеек» дзе трэба, а дзе, можа, і не...

Самая блізкая суседка, ганарліўка Гэля (заўсёды прыбраная, нафарбаваная, з яркімі пазногцямі, на высокіх абцасах), падышла да студні апошняй. З яўнай пагардай паглядзела на гатовы «аб'ект», на шчаслівага Міхася і сказала:

— Дзівак ты, суседзе. Гляджу я на цябе і думаю: «Ну хто зараз студні робіць? Мінулы ж век! А ў цяперашнім, дваццаць першым ды без водаправода... Не разумею, хто гэта можна. Мы вось з мужам сабе правялі, і цяпер любата: вада сама бяжыць і ў дом, і ў хлеў, і ў гарод. А ты ў дзве рукі за старое трымаешся. Аж смешна глядзець.

Адчытала так чалавека і, задраўшы нос, пакрочыла дамоў. Міхась хіба што патыліцу пачухаў: нават слова ёй сказаць не паспеў.

Усё лета — а было яно досыць гарачым — ён браў са студні ваду і са- праўды, як той дурань, цягаў на грады. Суседка Гэля з-за плота глядзела на гэта і яўна смяялася: маўляў, праўду ж табе казала.

Але вось наступіла восень, потым зіма, і з вясковай сістэмай водазабеспячэння пачало тварыцца нешта непрадказальнае. З-за нізкіх тэмператур, як тлумачылі камунальнікі, стала бараxліць рэле, а значыць, і вада ў кранах то з'яўлялася, то раптам прападала. І неяк прыстасавацца да гэтага было немагчыма, бо ніхто не ведаў, калі што адбудзецца...

Вось і тая ж Гэля прыйшла неяк вечарам з работы, кран адкруціла, а там хіба што паветра шыпіць.

І ў бітонах (яна іх спецыяльна з гарышча зняла) каб кропля якога запасу...

— Авохці мне, што ж рабіць!? — запанікавала жанчына, бо трэба ж нешта есці зварыць, потым посуд памыць. А галоўнае, сцены ў хлявах разносіла не напоеная скаціна (Гэля мусіла трымаць гаспадарку, бо муж заявіў, што з гультайкаю жыць не будзе)...

Карацей, іншага выйсця не засталося: ускінула Гэля нейкую старую куртку (зашпіліўшы, дарэчы, не на тыя гузікі), нацягнула на сваю прыгожую прычоску цяплейшую мужаву шапку, уссунула яго ж валёнкі, схапіла вёдры і, забыўшыся, як некалі смяялася, рушыла ў двор да свайго непрасунутага суседа. Там, у ягонай студні (шчасце, што той чалавек незласлівы быў і нічога ёй не сказаў) набрала ў вёдры вады і панесла дадому.

Напэўна, ёй цяжка было? Напэўна, з непрывычкі зашмат наліла (вада разлівалася проста ў галёшы)... Факт, што даяркі, сустрэўшы яе, вачам не паверылі: вось гэтакай — у скасабочанай куртцы, шапцы-аблавушцы, мокрых валёнках... яны сваю ганарліўку ніколі не бачылі!

Мелі, значыць, з чаго пасмяяцца, мелі аб чым пагаварыць ды заадно ўспомніць крылатае: не плюй у крыніцу — прыйдзеш па вадзіцу.

**Таццяна Ігнаценка,**
*Лёзненскі раён.*

## ЗВЫЧАЙНЫ МАЛЕНЬКІ ЦУД

Не ўсё ў жыцці здараецца, як чалавек спадзяецца. Ну, напрыклад, замест таго, каб у святы вечар варыць панцак, гатаваць куццю з разынкамі ды чакаць з'яўлення Бэтлеемскай зоркі, мы з мужам калаціліся ў халодным прыгарадным аўтобусе — спяшаліся ў вёску, за сорак вёрст, да нашага адзінокага родзіча. Ён, бедны, па-свойму вырашыў сустрэць Каляды: гэта значыць, запіў. Запіў не першы і, відаць, не апошні раз, бо ў абдымкі зялёнага змея ён трапляе амаль штомесяц, потым, «вылазячы», цяжка хварэе, клянецца, што ўсё, больш — ніколі, а потым...

На Каляды сіноптыкі абяцалі да мінус дваццаці. Мы з мужам ехалі, каб паглядзець, што там і як, каб прапаліць у печы...

Але ж, дзякаваць богу, свет не без добрых людзей! Калі падышлі да сваяковай хаты, убачылі, што з коміна ўецца дым.

— Нехта гаспадарыць, — узрадаваўся муж.

У хаце і сапраўды была суседка, паліла ў печы. Заўтра таксама абяцала прыйсці і, калі сіноптыкі не падмануць, — да дроў падкінуць брыкету.

Нам, выходзіць, можна было вяртацца дамоў. І мы чамусьці зусім не падумалі, а на чым канкрэтна? (Апошні аўтобус з гадзіну таму сышоў...)

Як некалі ў дзяцінстве, мы з мужам нацягнулі на вочы шапкі, пад каўняры завязалі шалікі і рушылі да цэнтральнай вясковай вуліцы.

Над намі, нагадваючы аб тым, што сёння казачны вечар, зззяла зорнае неба, пад нагамі меладычна парыпваў снег.

Не прымусіў чакаць і сапраўдны калядны цуд: цемнату раптам разрэзала святло аўтамабільных фар, незразумела адкуль з'явілася машына. На імгненне нам нават здалося, што за рулём — святар. І гэта ён адчыняе перад намі дзверцу з прыветным:

— Вас падвезці?

Змерзлыя і шчаслівыя, мы хуценька селі ў салон і ўбачылі, што за рулём звычайны малады хлапец — проста ў чорнай куртцы і шапцы. Нам было па дарозе: ён таксама ехаў у горад, больш за тое — у наш раён, а таму давёз аж да самага дома.

Там мы паспелі яшчэ зварыць куццю, усёй сям'ёй пасядзець за сталом і, вядома ж, пажадаць дабра ўсім тым, хто дбае не толькі пра сябе: усім тым, хто бачыць блізкіх.

**Наталля Шастакова,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

**АД ЯЕ Ж** (і, магчыма, новым падпісчыкам): пачынаючы з мінулага года, «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды» друкуюцца не проста так — наша газета праводзіць конкурс — на самую-самую лепшую.

Трэба сказаць, што вызначыць іх справа вельмі няпростая. Многія чытачы па нашай просьбе паспрабавалі гэта зрабіць і... «У гэтыя Калядныя вечары, — паведамляла, прынамсі, *спадарыня Нічыпаровіч з Уздзеншчыны,* — дастала я з шуфляды ўсе выпускі рубрыкі «Алё, народ на провадзе!», разам з мужам перачыталі ўсе публікацыі, круцілі і так і гэтак, але 10 гісторый выбраць ніяк не маглі. У нас усё роўна выходзіла 25».

«Дакладна ведаю, што вясёлыя гісторыі ад чытачоў «Звязды», — ужо са Жлобіна піша *спадарыня Таццяна Савенка,* — цікавыя не толькі людзям сталага ўзросту, але і моладзі. Ва ўсякім разе мая дачка (а ёй 28) з задавальненнем чытае іх. Некаторыя моманты з жыцця людзей у савецкі перыяд, здараецца, не вельмі разумее. І тады мы тлумачым, што і як было».

«Свежы нумар «Звязды» з паштовай скрынкі заўсёды забірае мой муж, адразу ж праглядае, ці ёсць там «Провад» і, у прыватнасці, байка Соф'і Кусянковай. Нам прыемна, што гэта аўтарка жыве ў нашай вёсцы, піша пра нашых людзей. Гэтыя ды іншыя цікавыя гісторыі муж заўсёды зачытвае — спачатку мне, а потым нясе газету на работу ў калгасную майстэрню. Мужыкі чытаюць там і «ржуць», успамінаюць мінулае», — піша *спадарыня Таццяна Борыкава з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне.*

Вядома ж, варты цытавання і ліст самой *спадарыні Кусянковай:* «Як па мне, дык «Провад» — гэта вельмі карысная вынаходка і свайго роду фішка «Звязды». Наколькі ведаю, ніводная газета не мае такой вось рубрыкі, такога «спецфарміравання» аўтараў, якія 16 гадоў (!) не толькі выпісваюць газету, але і пішуць праўду пра наша жыццё — якое яно было і якое ёсць, пішуць пра людзей — добрых і дрэнных, разумных і не вельмі... Адносна сябе магу сказаць, што дзякуючы найперш «Праваду» мая вёска Лучын і самі лучынцы сталі вядомымі амаль на аўцюкоўцы.

Што асабіста мне цікава ў любой гісторыі з гэтай рубрыкі? Ну, вядома ж, сама падзея (тое, што адбылося), а па-другое — манера яе «падачы», бо, згадзіцеся, можна па-сапраўднаму смешнае зрабіць ніякім, а ніякае — смешным», — працягвае спадарыня Соф'я. І яна ж, дарэчы, шчыра шкадуе, што падобны конкурс не праводзіўся раней, бо — цытата — «цяжка нават уявіць нейкую больш смешную гісторыю, чым «Доктар? Чараўнік» спадара Курсевіча, змешчаную ў «Звяздзе» 1 лістапада 2011 года. А наогул усе байкі, якія мне спадабаліся, я захоўваю і, калі маю час альбо дрэнны настрой, саджуся перачытваць. Лепшы занятак і лепшыя лекі для душы прыдумаць цяжка»...

Вось так.

А зараз — высновы. Паводле абагульненых меркаванняў вялікага чытацкага і невялічкага рэдакцыйнага журы, самымі цікавымі, запамінальнымі, шчырымі, мудрымі, смешнымі байкамі прызнаны: **«Калючы быў вожык» (Г. Нічыпаровіч, в. Магільна, Уздзенскі раён. «Звязда», 22 кастрычніка), «А не трэба крыўдзіць дзеда» (С. Кусянкова, в. Лучын, Рагачоўскі раён. «Звязда» 19 сакавіка), «Развод, альбо Пра тое, адкуль рогі растуць і як іх збіваюць» (Генадзь Р. —** прозвішча і зваротны адрас паведамляюцца толькі для рэдакцыі. **«Звязда», 23 красавіка), «На шчасце!» (А. Ліпень, Іўеўскі раён. «Звязда», 30 снежня), «Эх, каб не тыя драбіны» (Ф. Касаткіна, г. Паставы. «Звязда», 18 чэрвеня).**

На адрас менавіта гэтых аўтараў у самы найбліжэйшы час па пошце будуць адпраўлены хай сціплыя, але ж вельмі цёплыя падарункі.

Усім іншым аўтарам (найперш найбліжэйшым да перамогі **спадарыням Васільевай і Гузянковай з Гомеля, Чыгрынавай з Мінска, Каліноўскай з Віцебска, Волкавай з Маладзечна... А таксама спадарам Камароўскаму з Оршы, Гаўрышу з Чавусаў, Звярынскаму з Уздзеншчыны, Пальнскаму з Беразіно, Маскальчуку з Бераставіцы, Сачыўку з Карэлічыны, Калінковічу, Гаральчуку і Братку з Мінска)** акурат такія ж цёплыя словы падзякі за ўдзел у конкурсе, за сапраўднае задавальненне, якое дзякуючы іх працы, іх клопатам атрымалі ці не ўсе чытачы газеты.

Ім жа, і ўсім, хто чытае «Звязду», кароткі напамін: «Свет захаваўся, таму, што смяяўся. І думаў! Дык давайце рабіць гэта разам: конкурс, як заўважылі чытачы, працягваецца. А значыць, пішыце, дасылайце свае гісторыі.

А яшчэ, калі не лянота, па старой пяцібальнай сістэме ацэньвайце тыя, што змешчаны, складвайце публікацыі ў нейкую шуфлядку, каб потым, на фінішы года, яшчэ раз усё прачытаць, без сумневу — атрымаць задавальненне і зноўку вызначыць лепшых. Склад журы не мяняецца: у вялікім чытацкім (старшыня **сп. Соф'я Кусянкова**) па-ранейшаму ўсе ахвотныя, у невялічкім рэдакцыйным (старшыня — першы намеснік галоўнага рэдактара «Звязды» **сп. Наталля Карпенка**) — **рэдактар аддзела Надзея Дрыла (яна ж Дрындрожык), спецыяльны карэспандэнт Яраслаў Лыскавец і вядучая рубрыкі Валянціна Доўнар.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# ЗАМОВА НА ШЧАСЦЕ



## Аб чым прамаўчала бабуля-шаптуха

ЧАМУСЬЦІ менавіта сёння прыгадалася бабуля Шура з невялікай лясной вёсачкі Рудня, што на Лагойшчыне. Можа, таму, што акурат у гэтыя дні самы чароўны і таямнічы час, калі сняцца незвычайныя сны, ва ўсім бачацца нейкія знакі — пэўна, прачынаецца памяць продкаў, якія на Каляды варажылі на будучыню. А тут трынаццатае чысло на носе, ды яшчэ пятніца. Карацей, дні самыя што ні ёсць містычныя. А можа, успомніла я тую бабцю, бо менавіта ў такое надвор'е — золкае і пранізліва-халоднае, і менавіта ў сярэдзіне студзеня ўжо даклада не памятаю, якога года, шыбавала ад яе напрасткі па сцежцы ў незнаёмым заснежаным лесе, спадзеючыся паспець на апошні аўтобус у бок сталіцы. Сонца ўжо схавалася сярод калматых елак, мароз крапчэў, на нагах былі нейкія студэнцкія яшчэ чаравікі, вушы адубелі ад сіверу, бо шапкі на галаве не было ўвогуле. Не ведаю, чаго больш тады баялася: спазніцца на аўтобус і застацца начаваць у чужой вёсцы, ці прастыць і захварэць, бо назаўтра была назначана нейкая жыццёва важная сустрэча. А тут яшчэ ўбаку заскавытала нейкая жывёліна, і было незразумела, ці сабака гэта дзе ў вёсцы голас падае, ці скрыгоча зубамі галодны воўк, які напаў на след збянтэжанай падарожніцы.

Тая першая «дарослая», з усімі належнымі рэдакцыйнымі дакументамі, камандзіроўка скончылася надзвычай удала: ваўкі не дагналі, на аўтобус паспела (і ў ім была ўключана печка), вушы не адмерзлі, дома нават не кашлянула, матэрыял напісаўся лёгка, начальства яго не пакрэсліла, а старэйшыя калегі пахвалілі. Я і сёння ўпэўнена, што гэта быў не шчаслівы збег абставін, не простае шанцаванне. Гэта ўсё бабуля Шура — яна замовіла мне тады здароўе і ўдачу.

БАБУЛЯ Шура была шаптуха. Не чараўніца, не варажбітка, — яна дапамагала людзям замовамі ды яшчэ гаючымі травамі, што духмянымі букетамі звісалі на сценах у сенцах яе хаты. Спачатку гэта звычайная вясковая бабця з добрым тварам і спрацаванымі парэпанымі рукамі, даведаўшыся пра мэту майго прыезду (а рэдакцыйнае заданне было — напісаць пра яе і пра яе здольнасці), толькі з прыкрасцю адмахнулася: маўляў, што яшчэ надумала! Гаварыць аб сваім незвычайным уменні адмовілася наадрэз, а вось накарміць мяне наважылася з не меншай катэгарычнасцю. Спрытна выцягнула з печы гаршок вараной кіслай капусты, паставіла на стол міску бульбы ў мундзірах. «Адкуль толькі такія худэрбы бяруцца!»—жаласліва прыгаворвала, гледзячы, як з апетытам уплятаю яе пачастунак. Пакрысе разгаварыліся, бабуля расказала і пра свайго дзеда, які атрымаў здольнасць лекавання, убачыўшы аднойчы незвычайнае святло ля калодзежа, і пра тое, як уменне дапамагаць перайшло ад яго ў спадчыну. І пра тое, як важна быць чыстым душою, маючы гэта ўменне, інакш яно стане працаваць не на дабро, а наадварот, і пра тое, што патрэбна моцная вера ва Усявышняга, які даў гэту сілу і які з такой жа лёгкасцю можа яе забраць. І пра тое, што здарыцца гэта можа гарантавана, калі браць з людзей, якія прыйшлі па дапамогу, грошы ці якую іншую ўзнагароду па нейкай пэўнай таксе.

А яшчэ мне тады пашчасціла пагледзець, як бабуля замаўляе. Па дарозе на работу да яе забегла сваячка: забалеў зуб. Бабка Шура наліла ў місу ваду і пачала даволі гучна шаптаць над ёй. І былі ў той замове такія прыгожыя і родныя беларускія словы — бы паэму бабуля складала.

Яна, зусім ужо зміласцівіўшыся, і мне тады прапанавала пашаптаць — на кавалера. Шаптала на шакаладную цукерку, якой я павінна была ўпадабанага небараку пачаставаць. (Нічога, праўда, з гэтай авантуры не выйшла: цукерку са стала ўхапіў і з'еў зусім іншы, і даваўся пасля два гады ад яго палкіх пачуццяў, што невядома адкуль узяліся, ледзь не адбівацца.) І паабяцала мне, як пайду, замовіць на добрую дарогу і на ўдачу (мяркуючы па ўсім, і гэта абяцанне бабуля выканала).

ПАСЛЯ даваўлося гаварыць з даследчыкамі народнай культуры менавіта пра сілу замоў. Яны расказалі, што мала ведаць, у якім парадку і якія словы вымаўляць — нашмат важней тое, з якім настроем, з якімі пачуццямі, з якой энергетыкай ты іх гаворыш. Нават пажаданне добрага дня можа мець абсалютна процілеглы вынік, калі адрасавалі яго чалавеку, якому зайздросціце ці якога люта ненавідзіце... Не кажучы ўжо пра важнасць таго слоўнікавага запасу, якім мы карыстаемся ў зносінах штодня. А здольнасць дапамагаць словам іншым людзям маюць тыя, у каго да станоўчай энергетыкі і да гэтага самага запасу дадаецца яшчэ і шчырая безумоўная любоў да тых, хто вакол. Вось і ўвесь сакрэт «феномену шаптух»...

І яшчэ адна тэорыя мне падалася надзвычай цікавай: мы ўсе крыху чараўнікі. Асабліва ў цесным асяроддзі — у сям'і, у калектыве. Сказанае намі, незаўважна для нас саміх, накіроўваецца на нейкага чалавека і або перашкаджае, або спрыяе яму ў жыцці і справах. Галоўнае, зноў жа, ЯК і ШТО гаворым.

«ЯК» — хай застанецца на сумленні кожнага. А вось «што»... Знайшла ў Сеціве цікавую статыстыку — самыя папулярныя словы, сэнс якіх шукалі карыстальнікі на адным з самых буйных рускамоўных сайтаў у мінулым годзе. На першым месцы — «лабутэны». А далей — «глютэн», «метафара», «сквірт»... З нармальных, чалавечых слоў у тым «хіт-парадзе» толькі два. Але затое якія! «Талерантнасць» і «любоў».

Добрая аснова для замовы на шчасце і сабе, і ўсяму свету.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# ОБЪЯВЛЕНИЕ
## о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Набор мебели для спальни – «Карина» МДФ, в количестве 7 комплектов, общей стоимостью 5 733 рубля 22 копейки;<br>Лот №2. Набор мебели для кухни ЛДСТП, в количестве 20 комплектов, общей стоимостью 9 287 рублей 89 копеек |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Воропаевский ДОК» (УНН 300077686) |
| Местонахождение (адрес) имущества | Поставский р-н, г.п. Воропаево, ул. Заводская, 1 |
| Наличие обременений | Залог |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 31.01.2017 в 10.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого,10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, д. 10/1 (ww.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель Зиновенко Олег Олегович, тел. (80212) 61-40-22 моб. +375336879159<br>начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович тел. (80212) 61-40-15 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством;<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 30.01.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

# КОРМЯНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**(далее – Кормянский райисполком) доводит до сведения юридических лиц о проведении повторного открытого конкурса на право аренды рыболовных угодий фонда запаса Кормянского района – реки Сож 1 категории протяженностью 9 км от створного знака №217 вверх по течению до створного знака 226, с прилегающим пойменным водоемом: (старик «Коротьковский» – площадью 28 га).**

Срок договора аренды: 10 лет. Размер годовой арендной платы за рыболовные угодья составляет 271,40 руб. В дальнейшем размер ежегодной арендной платы за рыболовные угодья ежегодно уточняется областным исполнительным комитетом на основе индекса роста потребительских цен по отношению к декабрю предыдущего года.

Организатор конкурса – Кормянский райисполком.

Конкурс состоится «24» января 2017 г. в 11.00 по адресу: г. п. Корма, ул. Ильющенко, 34, малый зал райисполкома. Окончательный срок приема документов: «20» января 2017 г.

Предварительно ознакомиться с расположением рыболовных угодий можно по адресу приема документов.

Документы принимаются по адресу: г. Корма, ул. Ильющенко, 34. каб. 110, тел. 8 02337 21368 (секретарь комиссии) с 9 до 13 часов, с 14 до 17 часов, кроме субботы и воскресенья.

Торги проводятся в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 мая 2015 г. № 451 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса».

Участникам, не выигравшим конкурс, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после проведения конкурса.

**Условия конкурса**:

- создание и сохранение на период аренды не менее 5 рабочих мест;
- организация проката орудий рыболовства и маломерных судов;
- обустройство в течение года 2 благоустроенных мест отдыха для рыбаков;
- наличие материально-технической базы, соответствующей профилю деятельности;
- осуществление деятельности в соответствии с Правилами ведения рыболовного хозяйства и рыболовства, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими».
- участник, выигравший конкурс, в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает Кормянскому райисполкому путем безналичного расчета платежным поручением затраты на организацию и проведение конкурса – сумму оплаты за публикацию в средстве массовой информации извещения о проводимых торгах.

**Для участия в конкурсе необходимо предоставить следующие документы:**

- заявление о предоставлении рыболовных угодий в аренду (далее – заявление), сведения о рыболовных угодьях, которые участники желают получить в аренду;
- проект договора аренды рыболовных угодий;
- копию карты-схемы (части карты-схемы) соответствующих рыболовных угодий с нанесенными границами;
- биолого-экономическое обоснование, согласованное с Министерством сельского хозяйства и продовольствия и территориальными органами Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды, или рыбоводно-биологическое обоснование, имеющее положительное заключение государственной экологической экспертизы и утвержденное Министерством сельского хозяйства и продовольствия.
- предложения в письменной форме о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте;
- доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.
- заверенную банком копию платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка в областной бюджет в размере ежегодной арендной платы в сумме 271,40 рублей на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Гомельской области № 3600401001323 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Минск МФО 153001795, код назначения платежа 04004, УНП 400555165. Задаток вносится в срок не позднее «20» января 2017 г.»

БПС-СБЕРБАНК

Дата уведомления – 13.01.2017

## Уважаемые Владельцы (физические лица)

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

Операции по неактивному счету можно совершить в любом подразделении Банка.

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону:**
**148 – в стационарной сети**
**5-148-148 – в мобильных сетях**
**(+375 29/44) 5-148-148 – для международных звонков**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже линии по восстановлению автошин, принадлежащей ООО «Белретред» на праве собственности**

| Лот №1 | Линия для изготовления и раскроя металлокорда и сборки покрышек | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | | 44 542,80 | 2 500,00 | 2 230,00 |

1. Автоклав для наварки шин (в т. ч.: автоклав-основа, емкость для охлаждения жидкости) 1989 г. в. 2. Распылитель Airless 1997 г. в. 3. Ручной экструдер 1989 г. в. 4. Ручной шлифовальный прибор 1997 г. в. 5. Центр поглощения пыли Циклон ЦН-11-300, год выпуска – не установлен. 6. Инспекционная распорка 1997 г. в. 7. Станок для нанесения протектора шин 1992 г. в. 8. Станок для шерохования 1989 г.в. 9. Рессивер 5000 л 1992 г. в. 10. Кран-укосины – 3 шт. 1997 г. в. 11. Компрессор Boge S24 2001 г. в. Страна производитель: Франция. 12. Осушитель POLAIR HIRROSS 1997 г. в. 13. Стеллаж для хранения внешних энвелопов 1997 г. в. 14. Шкаф для хранения внутренних энвелопов 1997 г. в. 15. Складские кассеты – 73 шт. 1997 г. в. 16. Стол с опрокидывающим механизмом 1997 г. в. 17. Пневмостеплер Prebena. Страна производитель: Германия.1997 г. в. 18. Ремонтная распорка с инструментальной бабкой 1997 г. п. 19. Облицовочный стол для резки протектора. Страна производитель: Германия. 1992 г. в. 20. Резальная машина (резка прокладочной резины) 1997 г. в. 21. Установка для монтажа/демонтажа внешних оболочек 1997 г. в. 22. Монорельс. Страна производитель: Германия 1997 г. в. 23. Производственная линия и линия рационализации. Страна производитель: Германия T.Joosten. 1997 г. в.

Местонахождение предмета торгов: г. Минск, ул. Бабушкина, 48

УСЛОВИЯ

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

При заключении договора купли-продажи в обязательства Победителя аукциона (Претендента на покупку) будут включены требования по демонтажу, загрузке и вывозу Объекта за счет сил и средств Победителя аукциона (Претендента на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 13.02.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4**

**Продавец:** ООО «Белретред». **Ликвидатор:** частное предприятие по оказанию услуг «ПАКУМ» 2200005 г. Минск, ул. Смолячкова, 9, оф. 426, тел. 8 (029) 332-19-36.

**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом.9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется по 09.02.2017 г. на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «Белретред» (Лот №1), проводимом 13 февраля 2017 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 16.01.2017 г. в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 09.02.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Тимофеев Юрий Константинович, 8 (029) 332-19-36.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 08.01.2013 № 16 и Положения об организации и проведении аукционов.

Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: mailto:torgi@ino.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

ОРГАНИЗАТОР: ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| | |
|---|---|
| Адрес земельного участка | Витебская обл., Чашникский р-н., Лукомльский с/с, д. Белая Церковь, ул. Приозёрная, дом 20А |
| Кадастровый номер участка | 225183000301000035 |
